ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
01.08.2025 № 137

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» для II–V класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» (далей – вучэбная праграма) прызначана для II–V класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 34 гадзіны (1 гадзіна на тыдзень) у II класе; 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень) у III–V класах.

3. Мэта вывучэння вучэбнага прадмета «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» – выхаванне асобы, якая валодае неабходнымі для забеспячэння асабістай і грамадскай бяспекі маральнымі і фізічнымі якасцямі, ведамі правіл і норм бяспечнай жыццядзейнасці, уменнямі і навыкамі канструктыўнага ўзаемадзеяння з навакольнай рэчаіснасцю, досведам самазахавальных паводзін.

4. Задачы:

фарміраванне ўяўленняў пра асновы бяспекі жыццядзейнасці, выяўленне і ўсведамленне цеснай сувязі паміж камфортнай жыццядзейнасцю і бяспекай;

засваенне асноўных паняццяў, якія тычацца бяспечнай жыццядзейнасці, ведаў пра асабістую бяспеку, дарожны рух, пажарную бяспеку, здаровы лад жыцця;

выпрацоўка ўменняў і навыкаў абароны і самаабароны ў сітуацыях, небяспечных для фізічнага і псіхічнага здароўя, аказання першай дапамогі;

набыццё практычнага досведу па распазнаванні і ацэнцы розных небяспечных і надзвычайных сітуацый навакольнага асяроддзя; па садзейнічанні мінімізацыі або ліквідацыі (з улікам абстаноўкі і сваіх магчымасцей) небяспек і пагроз, якія ўзнікаюць;

выхаванне каштоўнасных адносін да навакольнага асяроддзя, уласнага здароўя і жыцця як формы існавання;

развіццё інтэлектуальных і творчых здольнасцей, асобасных і сацыяльна значных якасцей, самастойнасці і ініцыятыўнасці ў вырашэнні сітуацыйных задач.

5. Дадзеная вучэбная праграма вызначае наступныя змястоўныя лініі: асабістая і калектыўная бяспека; распазнаванне і ацэнка розных небяспечных і надзвычайных сітуацый, засцярога ад іх; навакольнае асяроддзе і бяспека ў ім; стаўленне да здароўя і здаровы лад жыцця. Структурна дадзеная вучэбная праграма (для кожнага класа) прадстаўлена наступным чынам:

I. Асабістая і калектыўная бяспека.

II. Засцярога ад надзвычайных сітуацый. Пажарная бяспека.

III. Навакольнае асяроддзе і бяспека.

IV. Здаровы лад жыцця.

Дадзеная вучэбная праграма пабудавана па лінейна-канцэнтрычным прынцыпе: вучэбны матэрыял раздзелаў прадстаўлены ў змесце кожнага класа, ад класа да класа ён ускладняецца і пашыраецца, уводзяцца новыя тэмы.

Педагагічны работнік мае права змяняць паслядоўнасць вывучэння раздзелаў і тэм для кожнага класа з улікам асаблівасцей умоў пражывання і наяўнасці матэрыяльна-тэхнічнай базы ва ўстанове адукацыі пры захаванні цэласнасці сістэмы падрыхтоўкі вучняў і логікі вывучэння зместу дадзенай вучэбнай праграмы.

6. Асноўная арганізацыйная форма рэалізацыі дадзенай вучэбнай праграмы – вучэбныя заняткі, якія ў залежнасці ад канкрэтных мэтавых установак могуць праходзіць у форме вуснага часопіса, інсцэніроўкі, ролевай і сітуацыйнай гульні, экскурсіі, відэасеанса, інтэрнэт-пошуку, абароны праекта і іншых форм.

Асноўнымі метадамі з’яўляюцца: гульнявыя метады; рашэнне сітуацыйных задач; практыкаванні-трэнінгі (на спецыяльна абсталяваных пляцоўках і аб’ектах); гутаркі; дыскусіі; расказы-прэзентацыі; чытанне і абмеркаванне мастацкіх твораў; дэманстрацыя фрагментаў мультыплікацыйных фільмаў і відэаматэрыялаў з наступным іх абмеркаваннем; ілюстрацыя; творчыя метады (тэматычнае маляванне, складанне гісторый, памятак). Пры гэтым абавязковай умовай з’яўляецца шматразовае (у розных формах) паўтарэнне вучнямі дзеянняў, якія імітуюць паводзіны на вуліцы, у двары, дома, у школе з мэтай выпрацоўкі прывычкі выконваць засвоеныя правілы бяспечных паводзін. У мэтах абароны навучэнцаў ад агрэсіі навакольных, а таксама для наладжвання партнёрскіх стасункаў з равеснікамі прадугледжаны тлумачальныя гутаркі (з прыцягненнем бацькоў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, якія працуюць з моладдзю), накіраваныя на выпрацоўку ў дзяцей стратэгій дзеянняў у сітуацыях, якія пагражаюць жыццю.

7. Чаканыя вынікі вывучэння зместу вучэбнага прадмета «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

7.1. Асобасныя вынікі:

праяўленне духоўных і фізічных якасцей, якія забяспечваюць абарону жыццёва важных інтарэсаў ад рознага роду пагроз;

усведамленне асабістай адказнасці за свае ўчынкі;

праяўленне талерантнасці ў міжасобасных узаемаадносінах;

праяўленне беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя;

разуменне важнасці бяспечнага і здаровага ладу жыцця;

стаўленне да ўласнага здароўя як да каштоўнасці;

наяўнасць перакананняў у неабходнасці выконваць правілы і нормы бяспечных паводзін, весці здаровы лад жыцця, адмаўляцца ад прапаноў,

якія навязваюцца і наносяць шкоду здароўю.

7.2. Метапрадметныя вынікі:

валоданне асновамі аналізу, сінтэзу, параўнання, класіфікацыі;

валоданне ўменнем прымаць вучэбную задачу як мэту, прытрымлівацца яе ў вучэбнай дзейнасці;

валоданне ўменнем планаваць свае дзеянні, вызначаць іх алгарытм і прытрымлівацца яго;

гатоўнасць весці дыялог, узаемадзейнічаць, супрацоўнічаць з навакольнымі, выконваць розныя сацыяльныя ролі ў калектыве;

здольнасць арыентавацца ў крыніцах інфармацыі, самастойна шукаць, успрымаць, аналізаваць і выбіраць патрэбную інфармацыю.

7.3. Прадметныя вынікі:

валоданне ўменнем распазнаваць небяспечныя і надзвычайныя сітуацыі ў навакольным асяроддзі (ва ўстанове адукацыі, у хатніх умовах, транспартных сродках, месцах вялікай колькасці людзей, на дарогах, у двары, прыродзе, на вадаёмах і каля іх) па характэрных прыметах іх праяўлення, а таксама на аснове аналізу спецыяльнай інфармацыі з розных крыніц;

валоданне элементарнымі нормамі і правіламі бяспечных паводзін на дарогах (удзельнічаючы ў дарожным руху ў якасці пешахода і пасажыра), ва ўстановах адукацыі, у доме, двары, прыродных умовах, пры сустрэчы з жывёламі, на вадаёмах, рэках і каля іх у розную пару года;

валоданне ўменнем дзейнічаць у адпаведнасці з правіламі бяспекі пры карыстанні глабальнай камп’ютарнай сеткай Інтэрнэт (далей – Інтэрнэт).

8. Для дыягностыкі сфарміраванасці ўменняў і навыкаў бяспечных паводзін рэкамендуюцца наступныя формы кантролю: франтальнае апытанне, індывідуальнае апытанне, практыкум, тэставая работа. У V класе, акрамя вышэйназваных, выкарыстоўваецца заліковая форма праверкі і ацэнкі ведаў.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў II КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 34 гадзіны)

### I. АСАБІСТАЯ І КАЛЕКТЫЎНАЯ БЯСПЕКА (16 гадзін)

#### Правілы дарожнага руху (12 гадзін)

##### Удзельнікі дарожнага руху

Азнаямленне з Правіламі дарожнага руху, зацверджанымі Указам

Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 лістапада 2005 г. № 551 «О мерах по повышению безопасности дорожного движения» (далей – Правілы дарожнага руху). Дарожны рух (пункт 2 падпункты 2.14, 2.17, 2.46, 2.60-1, 2.77 Правіл).

Пешаход як удзельнік дарожнага руху, спосабы яго перамяшчэння. Дзеці. Пешаход на сродку персанальнай мабільнасці (электрасамакаце, сігвеі, манаколе).

Вадзіцель як удзельнік дарожнага руху і транспартныя сродкі, якімі ён кіруе: аўтамабіль (аўтобус, легкавы аўтамабіль, грузавы аўтамабіль), веласіпед, гужавы транспартны сродак, колавы трактар, мапед, матацыкл, прычэп, самаходная машына, трамвай, тралейбус, электрамабіль (электробус, легкавы электрамабіль, грузавы электрамабіль) (пункт 2 падпункты 2.1, 2.2, 2.5, 2.8, 2.13, 2.22, 2.27, 2.28, 2.54, 2.60, 2.67, 2.69, 2.71, 2.77, 2.77-2 Правіл).

Ступень небяспекі кожнага з транспартных сродкаў для пешахода.

Пасажыр як удзельнік дарожнага руху і транспартныя сродкі, на якіх ён перамяшчаецца: аўтамабіль, аўтобус, маршрутны транспартны сродак, матацыкл, мапед, трамвай, тралейбус, электрамабіль (пункт 2 падпункты 2.1, 2.2, 2.13, 2.25, 2.27, 2.28, 2.44, 2.67, 2.71, 2.77 Правіл).

Выкананне Правіл усімі ўдзельнікамі дарожнага руху – неабходная ўмова забеспячэння бяспекі на дарогах.

## Дарога і яе элементы

Дарога. Элементы дарогі. Праезная частка дарогі. Трамвайныя пуці. Тратуар. Пешаходная дарожка. Астравок бяспекі. Абочына (пункт 2 падпункты 2.6, 2.15, 2.34, 2.42, 2.47, 2.49, 2.55, 2.58, 2.72, 2.78 Правіл).

Пешаходная дарожка, дарожныя знакі: «Пешаходная дарожка», «Канец пешаходнай дарожкі». Веласіпедная дарожка, дарожныя знакі: «Веласіпедная дарожка», «Канец веласіпеднай дарожкі». Дарожныя знакі «Веласіпедная і пешаходная дарожкі», «Канец веласіпеднай і пешаходнай дарожак» (дарожныя знакі 4.6.1, 4.6.2, 4.5.1, 4.5.2, 4.11.1, 4.11.2 (Дадатак 2 да Правіл)) і іх прызначэнне.

Бяспека на дарозе.

## Прыпыначны пункт маршрутнага транспартнага сродку

Пасадачная пляцоўка і прыпыначны пункт маршрутнага транспартнага сродку. Дарожныя знакі 5.12.1, 5.12.2, 5.13.1, 5.13.2 (Дадатак 2 да Правіл).

Правілы паводзін на пасадачных пляцоўках падчас чакання, па прыбыцці і пры адпраўленні маршрутных транспартных сродкаў. Пасадка ў маршрутны транспартны сродак, паводзіны ў ім і выхад з яго. Правілы

пераходу дарогі пры высадцы з маршрутнага транспартнага сродку (пункт 18 падпункт 18.4; пункт 23; пункт 24 падпункты 24.1–24.3 Правіл). Безгаспадарныя прадметы, пакінутыя на прыпыначным пункце, і бяспека дарожнага руху.

## Тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху

Тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху (пункт 2 падпункт 2.65 Правіл): дарожныя знакі, дарожная разметка, пешаходны святлафор. Пешаходны пераход. Дарожныя знакі «Рух пешаходаў забаронены», «Пешаходны пераход», «Падземны пешаходны пераход», «Надземны пешаходны пераход» (дарожныя знакі 3.10, 5.16.1, 5.16.2, 5.17.1–5.17.4 (Дадатак 2)) і іх прызначэнне. Пешаходны пераход рэгулюемы (пункты 39, 42 Правіл) і нерэгулюемы.

Святлафор, яго віды. Сігналы святлафора, іх прызначэнне (пункты 39, 42 Правіл).

Дарожная разметка на пешаходным пераходзе. Гарызантальная дарожная разметка 1.2, 1.14.1–1.14.3, 1.15, 1.17.1, 1.17.2, 1.29–1.31 (Дадатак 3 да Правіл) і яе прызначэнне.

Абавязак удзельнікаў дарожнага руху кіравацца ведамі аб тэхнічных сродках арганізацыі дарожнага руху (дарожных знаках, дарожнай разметцы, святлафоры) для забеспячэння асабістай і грамадскай бяспекі.

## Бяспечны маршрут у школу і са школы дадому

Двор, жылая зона. Перамяшчэнне ў школу і са школы дадому, выкарыстанне святлоадбівальных элементаў. Выбар бяспечнага маршруту. Правілы, якімі неабходна кіравацца для бяспечнага ўдзелу ў дарожным руху на маршруце «дом – школа – дом».

Пераход праезнай часткі дарогі ў спецыяльна абазначаных месцах (пункты 17, 39, 42, 114 Правіл; дарожныя знакі 5.16.1, 5.16.2, 5.38, 5.39 (Дадатак 2 да Правіл); лініі дарожнай разметкі 1.14.1–1.14.3, 1.15, 1.17.1, 1.17.2 (Дадатак 3 да Правіл)). Пераход праезнай часткі ў двары.

## Асаблівасці дарожнага руху ў розных умовах надвор’я

Уплыў пары года, надвор’я і часу сутак на бяспеку дарожнага руху. Правілы бяспекі, якімі неабходна кіравацца падчас руху ў розных умовах надвор’я.

### Віды і спосабы дзейнасці

Арыентаванне ў паняццях «удзельнікі дарожнага руху», «транспартныя сродкі», «дарожныя знакі», «святлафор». Апісанне (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) асаблівасцей розных транспартных сродкаў; вызначэнне ступені небяспекі, якая зыходзіць ад

кожнага з іх. Тлумачэнне неабходнасці прытрымлівацца асноўных правіл дарожнага руху па пераходзе праезнай часткі. Фармуляванне правіл бяспечных паводзін на прыпыначным пункце, падчас руху на дзіцячых веласіпедах, самакатах, ролікавых каньках, скейтбордах, пры катанні на лыжах, каньках, санках, надзіманых кругах (цюбінгах – снежных «ватрушках»). Распазнаванне дарожных знакаў (па форме, колеры, малюнку ўнутры), гарызантальнай дарожнай разметкі (па форме і колеры ліній) па характэрных прыметах. Апісанне (вуснае) дзеянняў па пераходзе праезнай часткі ў адпаведнасці з дарожнымі знакамі, лініямі гарызантальнай дарожнай разметкі, размешчанымі на дарозе. Маляванне эскіза флікера, яго дэманстрацыя. Тлумачэнне неабходнасці прымянення святлоадбівальных элементаў на вопратцы і асабістых рэчах пешаходаў. Мадэляванне бяспечных сітуацый дарожнага руху і вырашэнне сітуацыйных задач. Пераўтварэнне інфармацыі, прадстаўленай у выглядзе малюнкаў, у тэкставую задачу; рашэнне задачы. Назіранне за дарожным рухам падчас мэтавай прагулкі па раёне, у якім размешчана ўстанова адукацыі: арыентаванне ў дарожнай абстаноўцы каля школы, вызначэнне бяспечных месцаў пераходу праезнай часткі.

### Асабістая бяспека (4 гадзіны)

### Бяспечнае асяроддзе дома

Паняцці «небяспека» і «бяспека». Паводзіны дома ў выпадку адсутнасці дарослых; бяспечныя карысныя заняткі. Меры засцярогі пры карыстанні прадметамі хатняга ўжытку (шкляным посудам, сталовымі прыборамі, прыладамі для рукадзелля і дробнага рамонту).

Дзеянні, якія гарантуюць бяспеку пры званку ў дзверы незнаёмага чалавека.

Спосабы захоўвання ключа ад кватэры (дома). Дзеянні на лесвічнай пляцоўцы, калі выпадкова зачыніліся дзверы кватэры.

### Сварка з сябрамі – крыніца небяспекі

Правілы і нормы стасункаў паміж равеснікамі ў двары, класе. Паняцці «спрэчка» і «сварка». Дзеянні, якія дазваляюць пазбегнуць сварак. Шляхі вырашэння спрэчак.

### Правілы паводзін у выпадку выяўлення безгаспадарных або падазроных прадметаў

Безгаспадарныя або падазроныя прадметы. Дзеянні пры знаходжанні безгаспадарных, падазроных, выбухованебяспечных прадметаў у грамадскіх месцах, пад’ездзе дома.

Віды і спосабы дзейнасці

Характарыстыка (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) крыніц магчымай небяспекі і небяспечных сітуацый у кватэры (доме). Адрозненне

паняццяў «небяспечна» і «бяспечна». Складанне табліц з назвамі груп прадметаў і месцаў у доме, якія пры неспрыяльных умовах і неасцярожным карыстанні могуць стаць небяспечнымі. Праслухоўванне і аналіз невялікіх вусных выказванняў аднакласнікаў аб выпадках вымушанай адзіноты ў кватэры (доме): вызначэнне ў выступленнях інфармацыі, якая сведчыць пра веданне дзецьмі небяспечных ці бяспечных дзеянняў у кватэры (доме) падчас адсутнасці дарослых. Складанне памяткі па бяспечным карыстанні прадметамі хатняга ўжытку. Маляванне знакаў «Увага! Небяспечна!», якія можна размясціць у кватэры (доме) побач з небяспечнымі месцамі, прадметамі. Тлумачэнне неабходнасці выконваць асноўныя правілы бяспечных паводзін падчас знаходжання ў доме без дарослых. Фармуляванне высноў. Мадэляванне сяброўскіх узаемаадносін паміж равеснікамі. Складанне парадку дзеянняў па прымірэнні бакоў, якія пасварыліся.

Апісанне (вуснае) бяспечных дзеянняў у выпадку выяўлення безгаспадарных або падазроных прадметаў. Выяўленне тыповых памылак у паводзінах дзяцей, якія не ўмеюць прадбачыць небяспеку. Удзел у дыялогу з супрацоўнікам міліцыі: абмеркаванне правіл, якія гарантуюць бяспеку пры кантакце з незнаёмымі людзьмі ў пад’ездзе, ліфце, званку ў дзверы; замацаванне ведаў бяспечных дзеянняў пры спробе пранікнення ў дом пабочных асоб. Выпрацоўка прывычкі ні на якой падставе не адчыняць дзверы незнаёмым людзям.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра:

асноўныя паняцці, якія адносяцца да Правіл: «дарожны рух», «удзельнік дарожнага руху» (вадзіцель, пасажыр, пешаход); «сродкі персанальнай мабільнасці» (электрасамакат, сігвей, манакола); «элементы дарогі» (праезная частка дарогі, трамвайныя пуці, тратуар, пешаходная дарожка, астравок бяспекі, абочына); «пешаходны пераход»; «транспартныя сродкі»: аўтамабіль (аўтобус, легкавы аўтамабіль, грузавы аўтамабіль), веласіпед, гужавы транспартны сродак, колавы трактар, мапед, матацыкл, прычэп, самаходная машына, трамвай, тралейбус, электрамабіль (электробус, легкавы электрамабіль, грузавы электрамабіль), транспартны сродак аператыўнага прызначэння;

асноўныя паняцці, якія адносяцца да асабістай бяспекі («небяспека», «бяспека», «безгаспадарныя, падазроныя, выбухованебяспечныя прадметы»).

Ведаць:

дарожныя знакі «Пешаходная дарожка», «Канец пешаходнай дарожкі»; «Пешаходны пераход», «Падземны пешаходны пераход», «Надземны пешаходны пераход»; «Веласіпедная дарожка», «Канец веласіпеднай дарожкі»; «Жылая зона», «Канец жылой зоны»; «Прыпыначны пункт»; «Веласіпедная і пешаходная дарожкі», «Канец веласіпеднай і пешаходнай дарожак» і іх прызначэнне;

сігналы святлафора для пешаходаў;

бяспечны маршрут у школу і са школы;

пра магчымыя траўмы – наступствы выкарыстання сродкаў персанальнай мабільнасці (электрасамакатаў, сігвеяў і манаколаў);

крыніцы магчымай небяспекі і небяспечныя сітуацыі, якія могуць узнікнуць дома;

правілы паводзін у выпадку выяўлення безгаспадарных або падазроных прадметаў.

Умець:

выбіраць бяспечны маршрут у школу, са школы дадому і прытрымлівацца яго;

перасякаць праезную частку ў адпаведнасці з патрабаваннямі Правіл;

кіравацца правіламі бяспечных паводзін падчас руху ў якасці пешахода і пасажыра;

выконваць правілы бяспечных паводзін (у тым ліку пры званку ў дзверы чужых людзей), знаходзячыся дома без дарослых;

выконваць меры засцярогі пры карыстанні сталовымі прыборамі, інструментамі для рукадзелля і дробнага рамонту;

працаваць у групе, падтрымліваючы сяброўскія ўзаемаадносіны;

выконваць меры бяспекі пры выяўленні безгаспадарных, падазроных, выбухованебяспечных прадметаў.

## II. ЗАСЦЯРОГА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ. ПАЖАРНАЯ БЯСПЕКА (5 гадзін)

### Агонь і чалавек

Карысць, якую прыносіць агонь чалавеку. Уменне чалавека выкарыстоўваць агонь, кантраляваць яго. Шкода, якую наносіць агонь, калі выходзіць з–пад кантролю.

Азнаямленне з надзвычайнымі сітуацыямі. Пажар – надзвычайная сітуацыя. Патрабаванні па забеспячэнні пажарнай бяспекі.

### Пажары, якія ўзнікаюць у выніку гульняў з агнём

Пажаранебяспечныя гульні дзяцей. Пажары, якія ўзнікаюць ад свавольства дзяцей з запалкамі, запальнічкамі, іншымі прадметамі, што могуць стаць прычынай узгарання ў доме. Наступствы пажараў.

Недапушчальнасць гульняў дзяцей з запалкамі, запальнічкамі.

Папярэджанне пажараў і траўм у быце

Узнікненне пажараў ад электрапрыбораў. Меры засцярогі пры карыстанні электрапрыборамі. Элементарныя навыкі карыстання бытавымі электрапрыборамі (уключэнне, выключэнне).

Правілы паводзін, якія дазваляюць пазбегнуць апёкаў і траўм у кватэры (доме), памяшканнях малой плошчы (на кухні).

Спосабы паведамлення
пра неабходнасць аказання экстранай дапамогі пры пажары

Выклік пажарнай службы па тэлефоне; звесткі, якія пры гэтым неабходна паведаміць. Дзеянні пры немагчымасці выкліку ратавальнікаў па тэлефоне. Зварот да дарослых (суседзяў, прахожых), падача сігналу аб сваім месцазнаходжанні пасля прыбыцця пажарнай службы. Шкода, якая наносіцца непраўдзівым выклікам пажарнай службы па тэлефоне; адказнасць за непраўдзівы выклік.

Віды і спосабы дзейнасці

Адрозненне паняццяў «сітуацыя» і «надзвычайная сітуацыя». Арыентаванне ў паняццях, якія адносяцца да пажарнай бяспекі. Тлумачэнне ўмоў і прычын узнікнення пажараў. Фармуляванне элементарных правіл пажарнай бяспекі ў быце (у тым ліку забарона на карыстанне запалкамі, запальнічкамі і гульні з імі). Характарыстыка (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) бытавых электрапрыбораў. Апісанне (вуснае) мер засцярогі пры карыстанні бытавымі электрапрыборамі. Пераўтварэнне інфармацыі, прадстаўленай у выглядзе малюнкаў, у тэкставыя задачы па правілах пажарнай бяспекі на кухні; рашэнне задач. Мадэляванне сітуацый: уключэнне і выключэнне бытавых электрапрыбораў; магчымае ўзгаранне на кухні, узгаранне электрапрыбораў. Разгляд і запамінанне алгарытму дзеянняў па выкліку экстраных службаў. Мадэляванне сітуацыі: выклік экстранай службы па тэлефоне; дзеянні пры немагчымасці выклікаць ратавальнікаў па тэлефоне. Групаванне прапанаваных гульняў па прымеце небяспечныя ці бяспечныя з абгрунтаваннем выбару.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне:

аб надзвычайных і небяспечных сітуацыях;

прычынах узнікнення пажараў і іх наступствах для навакольнага асяроддзя, жыцця і бяспекі людзей.

Ведаць:

элементарныя правілы пажарнай бяспекі ў быце;

пра недапушчальнасць гульняў з запалкамі, запальнічкамі;

элементарныя правілы карыстання бытавымі электрапрыборамі;

спосабы паведамлення пра неабходнасць аказання экстранай дапамогі пры пажары;

нумары тэлефонаў экстраных службаў: органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, пажарнай аварыйна-выратавальнай службы.

Умець:

выконваць меры бяспекі, якія дазваляюць пазбегнуць апёкаў і траўм у кватэры (доме), памяшканнях малой плошчы (на кухні);

выконваць меры засцярогі пры карыстанні бытавымі электрапрыборамі;

уключаць і выключаць бытавыя электрапрыборы;

самастойна выклікаць экстраныя службы: органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, пажарную аварыйна-выратавальную службу.

## III. НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ І БЯСПЕКА (5 гадзін)

### Бяспечныя паводзіны ў жылых і адміністрацыйных будынках

Дапаможныя памяшканні ў жылых і адміністрацыйных будынках (падвалы, гарышчы, балконы, лесвічныя пляцоўкі), іх прызначэнне. Паняцце «небяспечная вышыня». Недапушчальнасць гульняў у падвалах і на гарышчах. Бяспека пры ўваходзе ў пад’езд, ліфт. Паводзіны ў ліфце.

### Бяспечнае асяроддзе ва ўстанове адукацыі

Калідоры, класы і іншыя школьныя памяшканні, іх прызначэнне. Бяспечныя паводзіны ў класе, калідорах, гардэробе, на лесвіцах. Бяспечныя паводзіны на перапынках. Меры засцярогі пры карыстанні ў класе школьнымі прыладамі (ручкамі, алоўкамі, тачылкамі, лінейкамі). Правілы забеспячэння захаванасці асабістых рэчаў.

### Бяспечныя паводзіны ў двары

Гульнявая пляцоўка. Бяспечныя гульні ў двары. Правілы бяспекі пры катанні на арэлях. Месцы асаблівай небяспекі ў двары (прыстаўныя лесвіцы, ачышчальныя збудаванні, калодзежы, траншэі, люкі, трансфарматарныя будкі); забарона на наведванне гэтых месцаў.

Правілы паводзін пры сустрэчы з незнаёмымі людзьмі ў двары.

### Правілы бяспечных паводзін на вадзе

Прыродныя (мора, сажалкі, азёры) і штучныя (вадасховішчы, басейны, аквапаркі) вадаёмы. Бяспечныя паводзіны пры знаходжанні каля

вадаёмаў, рэк у розную пару года. Выкананне правіл бяспекі пры купанні ў абсталяваных месцах.

Свойская жывёла

Свойская жывёла ў горадзе і сельскай мясцовасці. Магчымасць атрымання траўм ад жывёлы (драпіны, укусы), іх наступствы. Выпадкі агрэсіўнасці і шаленства жывёлы. Меры бяспекі пры зносінах са свойскай жывёлай, яе догляд.

Віды і спосабы дзейнасці

Апісанне (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) адміністрацыйных і жылых будынкаў. Тлумачэнне асаблівасцей жыццезабеспячэння жылля. Вызначэнне небяспечных месцаў і зон у будынках, у тым ліку ў дамах. Пераканаўчае тлумачэнне забароны на наведванне гарышчаў і падвалаў. Складанне памятак па правілах бяспечных паводзін у пад’ездзе, ліфце, установе адукацыі, двары, пры знаходжанні каля вадаёмаў у розную пару года. Рашэнне сітуацыйных задач, звязаных з правіламі паводзін у пад’ездзе, ліфце, на перапынках ва ўстановах адукацыі, ля вадаёмаў. Складанне плаката «Перапынак!» пра правілы паводзін на перапынках. Праслухоўванне і аналіз выступленняў аднакласнікаў аб гадаванцах, якія пражываюць у іх у кватэры (доме): вызначэнне ў выступленнях інфармацыі, якая сведчыць пра веданне дзецьмі небяспечных ці бяспечных дзеянняў па доглядзе жывёлы. Вызначэнне прычын агрэсіўнасці жывёлы. Тлумачэнне неабходнасці выконваць меры засцярогі пры кантакце з жывёлай, бяздомнай жывёлай. Фармуляванне (з апорай на даведачны матэрыял) мер засцярогі ад укусаў рознай жывёлы.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць:

крыніцы магчымай небяспекі і небяспечных сітуацый, якія могуць узнікнуць у жылых і адміністрацыйных будынках, установах адукацыі;

пра забарону на наведванне падвалаў, гарышчаў;

правілы паводзін у пад’ездзе, ліфце;

правілы паводзін на перапынках паміж урокамі;

месцы асаблівай небяспекі ў двары (прыстаўныя лесвіцы, ачышчальныя збудаванні, калодзежы, траншэі, люкі, трансфарматарныя будкі);

пра небяспечныя сітуацыі, якія могуць узнікнуць пры кантактах з незнаёмымі людзьмі;

агульныя правілы паводзін пры знаходжанні каля вадаёмаў у розную пару года;

пра пагрозы, якія зыходзяць ад жывёлы (у тым ліку свойскай).

Умець:

кіравацца правіламі паводзін пры карыстанні ліфтам;

пазбягаць узнікнення траўманебяспечных сітуацый у памяшканнях установы адукацыі (у калідорах, гардэробе, на лесвіцах);

выконваць правілы паводзін на перапынках паміж урокамі;

акуратна і асцярожна карыстацца школьнымі прыладамі (ручкамі, алоўкамі, тачылкамі, лінейкамі);

мець бяспечныя зносіны з незнаёмымі людзьмі ў двары, на вуліцы;

кіравацца правіламі бяспекі пры купанні ў абсталяваных месцах;

выконваць меры бяспекі пры зносінах са свойскай жывёлай.

## IV. ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ (8 гадзін)

### Актыўныя формы здаровага ладу жыцця

Значэнне рэжыму дня, ранішняй гімнастыкі і загартоўвання для здароўя. Адзенне па сезоне. Роля заняткаў фізкультурай і спортам у жыцці чалавека.

### Правілы гігіены

Асабістая гігіена. Спосабы перадачы інфекцыйных захворванняў. Папярэджанне інфекцыйных захворванняў шляхам захавання асабістай гігіены. Прафілактыка захворванняў, выкліканых паразітамі.

### Харчаванне і здароўе

Правільнае харчаванне – залог здароўя і прыгажосці. Прафілактыка пераядання. Гігіена харчавання.

### Карысныя і шкодныя прывычкі

Карысныя прывычкі і іх уплыў на здароўе. Згубныя наступствы шкодных прывычак (уплыў алкаголю і наркотыкаў на здароўе і паводзіны чалавека; шкода, якую наносіць здароўю чалавека курэнне).

### Выклік брыгады хуткай медыцынскай дапамогі

Сітуацыі, якія патрабуюць выкліку брыгады хуткай медыцынскай дапамогі. Выклік брыгады хуткай медыцынскай дапамогі па тэлефоне (алгарытм дзеянняў); звесткі, якія пры гэтым неабходна паведаміць. Адпрацоўка дзеянняў па выкліку брыгады хуткай медыцынскай дапамогі. Адказнасць за непраўдзівы выклік.

Віды і спосабы дзейнасці

Арыентаванне ў паняццях «здароўе», «здаровы лад жыцця», «рэжым дня», «гігіена харчавання». Устанаўленне сувязі паміж фізічнымі заняткамі, загартоўваннем, харчаваннем, трыманнем рэжыму дня і здароўем. Класіфікацыя прывычак па карыснасці. Тлумачэнне неабходнасці прытрымліваццa рэжыму дня. Вызначэнне карысных прывычак.

Рашэнне сітуацыйных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроках інфармацыі. Складанне індывідуальнага распарадку дня. Праслухоўванне і аналіз выступленняў аднакласнікаў аб занятках спортам, карысных прывычках: вызначэнне ў выступленнях інфармацыі, якая сведчыць аб правільнай трактоўцы дзецьмі паняццяў «карысныя ці шкодныя прывычкі». Развучванне комплексу ранішняй гімнастыкі. Групаванне адзення па сезоне; фармуляванне вывадаў.

Абмеркаванне правіл карыстання тэлефонам (можна или нельга, правільна ці няправільна) пры выкліку брыгады хуткай медыцынскай дапамогі. Апісанне (вуснае) алгарытму дзеянняў па выкліку брыгады хуткай медыцынскай дапамогі. Мадэляванне сітуацыі перадачы паведамлення з выкарыстаннем мабільнага тэлефона.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне:

аб асноўных паняццях, якія адносяцца да здаровага ладу жыцця: «здароўе», «здаровы лад жыцця»;

рэжыме дня і яго ўплыве на жыццядзейнасць чалавека;

карысных прывычках і згубных наступствах шкодных прывычак.

Ведаць:

правілы асабістай гігіены;

парадак выкліку брыгады хуткай медыцынскай дапамогі.

Умець:

складаць распарадак дня і прытрымліваццa яго;

самастойна апранацца ў адпаведнасці з умовамі надвор’я;

выконваць правілы асабістай гігіены;

даглядаць сваё цела;

самастойна выклікаць брыгаду хуткай медыцынскай дапамогі.

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА В III КЛАСЕ.
## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін)

# І. АСАБІСТАЯ І КАЛЕКТЫЎНАЯ БЯСПЕКА (8 гадзін)

## Правілы дарожнага руху (6 гадзін)

### Пешаход як удзельнік дарожнага руху і небяспечныя сітуацыі на дарозе

Значэнне вывучэння Правіл дарожнага руху для бяспечнага ўдзелу ў дарожным руху. Правы і абавязкі пешаходаў як удзельнікаў дарожнага руху (пункт 2 падпункт 2.46; пункты 16, 17 Правіл дарожнага руху).

Выкананне Правіл дарожнага руху пры катанні на самакаце, ролікавых каньках, скейтбордах у раёне пражывання, а таксама пры катанні на дзіцячых веласіпедах (пункт 17 падпункт 17.2-1 Правіл дарожнага руху).

Дарожныя знакі «Жылая зона», «Канец жылой зоны» (дарожныя знакі 5.38, 5.39 (Дадатак 2 да Правіл дарожнага руху)).

Узнікненне небяспечных сітуацый для пешаходаў падчас руху па дарозе, у жылой зоне. Прычыны дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей, неабходнасць выкарыстання флікераў у цёмны час сутак. Прафілактыка дарожна-транспартнага траўматызму (главы 2, 4; пункт 135 Правіл дарожнага руху).

### Групы дарожных знакаў для пешаходаў

Тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху. Азнаямленне з групамі дарожных знакаў для пешаходаў: забараняльныя, прадпісальныя, інфармацыйна-указальныя знакі, знакі сэрвісу; іх прызначэнне (дарожныя знакі 3.10, 4.5.1, 4.5.2, 4.6.1, 4.6.2, 4.11.1, 4.11.2, 5.12.1–5.14.1, 5.16.1, 5.16.2, 5.17.1–5.17.4, 5.38–5.41, 6.1, 6.2, 6.6–6.15 (Дадатак 2 да Правіл дарожнага руху)).

### Скрыжаванні дарог

Рух па вуліцах населенага пункта. Правілы, якімі неабходна кіравацца для бяспечнага руху праз праезную частку дарогі на рэгулюемых і нерэгулюемых скрыжаваннях і па-за скрыжаваннямі. Раздзяляльная паласа і раздзяляльная зона на праезнай частцы. Астравок бяспекі на раздзяляльнай паласе (пункт 2 падпункты 2.42, 2.45, 2.57, 2.58; пункт 17 падпункт 17.2; пункты 18, 42; пункт 50 падпункты 50.2, 50.3; пункты 102, 114, 115 Правіл дарожнага руху).

### Асаблівасці дарожнага руху зімой

Асаблівасці зімовых дарог. Бяспечны рух па зімовых дарогах (па тратуары, пешаходнай дарожцы, абочыне). Асаблівасці пераходу праезнай

часткі дарогі зімой. Катанне на санках, цюбінгах (снежных «ватрушках»), каньках, лыжах і бяспека дарожнага руху.

Віды і спосабы дзейнасці

Групаванне дарожных знакаў па іх прызначэнні. Характарыстыка (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) груп дарожных знакаў. Тлумачэнне неабходнасці выконваць пешаходам правілы перасячэння праезнай часткі на скрыжаванні. Фармуляванне правіл бяспечнага руху па зімовых дарогах. Мадэляванне бяспечных сітуацый дарожнага руху і вырашэнне сітуацыйных задач. Пераўтварэнне інфармацыі, прадстаўленай у выглядзе малюнкаў, у тэкставыя задачы па правілах катання на санках, цюбінгах (снежных «ватрушках»), каньках, лыжах; рашэнне задач. Складанне памятак па правілах катання на санках, цюбінгах (снежных «ватрушках»), каньках, лыжах. Маляванне плакатаў на тэму «Зімовыя забавы». Удзел у дыялогу з супрацоўнікам Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства Унутраных спраў (ДАІ) пры абмеркаванні праслуханай інфармацыі аб руху на скрыжаваннях, асаблівасцях дарожнага руху зімой, правілах бяспекі на зімовых дарогах: абагульненне інфармацыі.

Асабістая бяспека (2 гадзіны)

Правілы аховы інфармацыі пры размове па тэлефоне. Асабістыя дадзеныя: адрас і тэлефон – канфідэнцыйная інфармацыя.

Спосабы аховы дома ад чужых людзей. Дзеянні, якія прадухіляюць магчымасць пранікнення ў кватэру (дом) незнаёмых людзей.

Нумары тэлефонаў і спосабы выкліку экстраных службаў: міліцыі, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, пажарнай аварыйна-выратавальнай службы. Недапушчальнасць непраўдзівых паведамленняў па тэлефоне аб небяспецы.

Віды і спосабы дзейнасці

Арыентаванне ў паняццях, якія адносяцца да спосабаў аховы дома ад чужых людзей. Тлумачэнне неабходнасці выконваць правілы бяспекі падчас дыялогу па тэлефоне. Апісанне (вуснае) бяспечнага дыялогу з незнаёмым чалавекам пры размове па тэлефоне. Рашэнне сітуацыйных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроках інфармацыі. Фармуляванне вывадаў. Абмеркаванне правіл карыстання тэлефонам (можна ці нельга, правільна ці няправільна) пры выкліку органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, пажарнай аварыйна–выратавальнай службы, міліцыі. Мадэляванне сітуацый: ахова дома ад чужых людзей; выклік экстраных службаў з выкарыстаннем мабільнага тэлефона.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць:

групы дарожных знакаў (забараняючых, прадпісваючых, інфармацыйна-указальных, знакаў сэрвісу) і іх прызначэнне;

пра скрыжаванне і правілы яго перасячэння пешаходамі;

правы і абавязкі пешаходаў;

правілы бяспекі на зімовых дарогах;

правілы аховы інфармацыі пры размове па тэлефоне;

пра спосабы аховы дома ад чужых людзей.

Умець:

кіравацца дарожнымі знакамі падчас руху па дарогах;

пераходзіць праезную частку на скрыжаваннях у адпаведнасці з Правіламі дарожнага руху;

бяспечна рухацца па зімовых дарогах (па тратуары, пешаходнай дарожцы, абочыне);

катацца на санках, коньках, лыжах, цюбінгах (снежных «ватрушках»), выконваючы правілы бяспекі;

выконваць правілы бяспекі пры размове з незнаёмымі людзьмі, якія звоняць у дзверы або па тэлефоне;

выкарыстоўваць спосабы аховы дома ад чужых людзей.

## II. ЗАСЦЯРОГА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ. ПАЖАРНАЯ БЯСПЕКА (8 гадзін)

### Пажарная бяспека ў кватэры (доме)

Асноўныя прычыны пажараў у кватэры (доме).

Пажарная небяспека печаў, камінаў. Меры бяспекі пры карыстанні печамі і камінамі.

Патрабаванні па забеспячэнні пажарнай бяспекі пры карыстанні электраабагравальнікамі.

### Спосабы самастойнай эвакуацыі з кватэры (дома)

Шляхі і спосабы самастойнай эвакуацыі з кватэры (дома) у выпадку пажару. Выбар найбольш бяспечнага шляху да выхаду. Забеспячэнне бяспекі пры эвакуацыі.

### Небяспека выкарыстання агню і піратэхнічных вырабаў пры правядзенні святочных мерапрыемстваў

Піратэхнічныя вырабы, іх разнастайнасць і прызначэнне. Правілы бяспекі пры куплі і выкарыстанні піратэхнічных вырабаў.

Недапушчальнасць выкарыстання свечак, петард, бенгальскіх агнёў у памяшканнях падчас святочных мерапрыемстваў.

Дым і яго небяспека

Небяспека задымленага памяшкання, пад’езда, ліфта. Распаўсюджванне дыму. Атрутныя рэчывы, якія выдзяляюцца пры гарэнні. Ахова органаў дыхання ад дыму. Алгарытм дзеянняў пры выхадзе з задымленага памяшкання, адпрацоўка дзеянняў.

Пажары, якія ўзнікаюць восенню і вясной

Пажары, прычынамі якіх з’яўляецца ўзгаранне сухой травы, лісця восенню і вясной. Недапушчальнасць выпальвання сухой травы, лісця. Бяспечныя спосабы ўтылізацыі леташняга лісця і травы.

Меры бяспекі на прысядзібных участках пры раскладванні агню для спальвання сухіх галінак, леташняй травы і лісця, смецця.

Аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі

Прызначэнне аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, іх функцыянаванне. Дзеянні ў выпадку спрацоўвання аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка.

Віды і спосабы дзейнасці

Апісанне (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) асаблівасцей печаў і камінаў; піратэхнічных вырабаў. Вызначэнне мер бяспекі пры карыстанні імі. Пераканаўчае тлумачэнне забароны на распальванне печаў і камінаў дзецьмі. Тлумачэнне (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) небяспекі дыму, задымленых памяшканняў. Праслухоўванне і аналіз выступленняў аднакласнікаў з прыкладамі выкарыстання піратэхнічных вырабаў: вызначэнне ў выступленнях інфармацыі, якая сведчыць аб веданні ці няведанні дзецьмі правіл карыстання піратэхнічнымі вырабамі. Аналіз прапанаваных для разгляду жыццёвых сітуацый (з выкарыстаннем ілюстрацый або слайдаў мультымедыйнай прэзентацыі): узнікненне пажараў у кватэрах (дамах), спосабы эвакуацыі. Складанне алгарытмаў дзеянняў па самастойнай эвакуацыі з кватэры (дома) у выпадку пажару, па выхадзе з задымленага памяшкання. Мадэляванне сітуацый: эвакуацыя з кватэры (дома), выхад з задымленага памяшкання. Адпрацоўка дзеянняў па эвакуацыі. Удзел у дыялогу з супрацоўнікам МНС пры абмеркаванні праслуханай інфармацыі аб небяспецы выкарыстання адкрытага агню (свечак) і піратэхнічных вырабаў пры правядзенні святочных мерапрыемстваў: фармуляванне мер бяспекі пры правядзенні святочных мерапрыемстваў.

# АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць пра:

пажаранебяспеку печаў, камінаў;

піратэхнічныя вырабы, правілы куплі і меры бяспекі пры іх выкарыстанні;

небяспеку дыму і задымленага памяшкання, пад’езда, ліфта;

недапушчальнасць выпальвання сухой травы;

прызначэнне аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка.

Умець:

самастойна эвакуіравацца з жылога памяшкання пры ўзнікненні пажару, выбіраючы найбольш бяспечны шлях да выхаду;

карыстацца падручнымі сродкамі аховы пры задымленні;

адрозніваць сігнал аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка і дзейнічаць у адпаведнасці з правіламі.

## III. НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ І БЯСПЕКА (13 гадзін)

### Бяспечныя паводзіны ў двары

Бяспечны рэжым прагулак. Небяспечныя сітуацыі, якія могуць узнікнуць пры кантактах з незнаёмымі людзьмі. Распазнаванне небяспечных намераў людзей (несупадзенне прыемнай знешнасці і нядобрых намераў). Правілы бяспечных зносін з незнаёмымі людзьмі на вуліцы. Правілы бяспечнага знаходжання на вуліцы ў вячэрні час.

Правілы бяспечных паводзін пры выяўленні безгаспадарных і падазроных прадметаў у двары. Алгарытм інфармавання пра іх выяўленне.

### Месцы асаблівай небяспекі

Кар’еры, яры, будаўнічыя пляцоўкі, цеплатрасы – месцы асаблівай небяспекі. Забарона наведвання такіх месцаў як мера прадухілення небяспекі і пагроз для жыцця і здароўя чалавека. Правілы бяспечнага знаходжання ў лесапасадцы, лесе.

Меры бяспекі ў месцах вялікай колькасці людзей (на вакзалах, рынках, стадыёнах, у гіпермаркетах).

### Прырода і чалавек

Прыроднае асяроддзе (аб’екты жывой і нежывой прыроды). Правілы бяспечных паводзін падчас прагулак у скверы, парку, лесе. Адзенне і абутак для прагулак у лесе. Паводзіны чалавека, які згубіўся ў парку, лесе, адстаў ад групы.

## Правілы паводзін пры сустрэчы з жывёламі

Небяспечныя насякомыя – восы, пчолы, шэршні, чмялі, мурашкі, камары. Кляшчы. Ядавітыя змеі. Правілы паводзін пры сутыкненні з небяспечнымі насякомымі, змеямі. Меры засцярогі ад небяспечных насякомых, кляшчоў, змей.

## Правілы бяспекі пры любым надвор’і

З’явы надвор’я (навальніца, туман, град, снегапад) і іх магчымыя небяспекі. Дзеянні, якія гарантуюць бяспеку ў неспрыяльных умовах надвор’я (у навальніцу, туман, снегапад) пры знаходжанні ў лесе, поле, каля вадаёма.

## Газ як крыніца магчымай небяспекі

Прыродны газ у быце. Першыя прыметы ўцечкі газу. Дзеянні ў выпадку ўцечкі бытавога газу; спосабы паведамлення аб небяспецы. Выклік аварыйнай газавай службы па тэлефоне.

## Бяспека на вадзе

Спосабы пераправы цераз раку. Бяспечнае перамяшчэнне па мастах і мосціках. Прыметы і небяспека тонкага лёду. Забарона руху па лёдзе вадаёмаў. Меры засцярогі пры змушаным руху па лёдзе вадаёмаў. Дапамога чалавеку, які праваліўся пад лёд.

Небяспека дрыгвы, балот. Меры экстранай дапамогі пры пападанні ў дрыгву, балота.

## Адпачынак каля вадаёма

Бяспечны адпачынак каля вадаёма ў летнюю пару года. Правілы паводзін на вадзе пры купанні, адпачынку каля вады, катанні на лодцы. Недапушчальнасць свавольстваў у вадзе. Асноўныя выратавальныя сродкі, іх прызначэнне, спосабы самавыратавання на вадзе.

## Першая дапамога пры сонечных апёках, сонечных і цеплавых ударах

Правілы паводзін каля вадаёмаў у спякотнае надвор’е. Сонца карыснае і небяспечнае. Адзенне і галаўныя ўборы для спякотнага надвор’я. Смага і яе спаталенне.

Прыметы сонечных і цеплавых удараў, сонечнага апёку. Меры па папярэджанні сонечных апёкаў, сонечных і цеплавых удараў. Агульныя правілы аказання першай дапамогі пацярпелым пры цеплавым удары, сонечным апёку.

## Першая дапамога пры абмаражэнні і пераахаладжэнні

Адзенне і абутак для зімовага надвор'я. Меры прафілактыкі абмаражэння. Прыметы абмаражэння. Агульныя правілы аказання першай дапамогі пры абмаражэнні і пераахаладжэнні.

Віды і спосабы дзейнасці

Арыентаванне ў інфармацыі пра небяспечных насякомых і хваробы, якія перадаюцца пры іх укусах. Пералічэнне месцаў асаблівай небяспекі ў навакольным асяроддзі, тлумачэнне забароны на іх наведванне. Характарыстыка (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) з'яў надвор'я (навальніцы, туману, граду, снегападу) і іх магчымых пагроз. Устанаўленне прычынна-выніковых сувязей паміж тэмпературай навакольнага асяроддзя, умовамі надвор'я і здароўем чалавека. Апісанне (вуснае) прымет і небяспек тонкага лёду, дрыгвы, балот, сонечных і цеплавых udараў.

Класіфікацыя адзення, галаўных убораў, абутку па сезоне і умовах надвор'я.

Паўтарэнне (узнаўленне) з урокаў «Чалавек і свет» ведаў пра атрутных змей, насякомых, кляшчоў: вычляненне інфармацыі, якая даказвае, што кантакт з імі нясе пагрозу здароўю чалавека. Распазнаванне небяспечных насякомых, кляшчоў па характэрных прыметах. Тлумачэнне агульных правіл бяспечных паводзін на вадаёмах. Пераўтварэнне інфармацыі, прадстаўленай у выглядзе малюнкаў, у тэкставыя задачы па выкарыстанні выратавальных сродкаў. Фармуляванне (з апорай на даведачны матэрыял) правіл купання ў абсталяваных месцах. Апісанне (вуснае) правіл сама- і ўзаемадапамогі для пацярпеўшых бедства на вадзе. Складанне памятак па правілах бяспечных паводзін пры знаходжанні каля вадаёмаў у розную пару года, аб спосабах засцярогі ад небяспечных прадстаўнікоў флоры і фаўны. Выпрацоўка (з апорай на алгарытм) бяспечных дзеянняў пры сустрэчы з дзікай жывёлай, укусах змей, кляшчоў і насякомых. Тлумачэнне неабходнасці выконваць меры бяспекі ў выпадку ўцечкі бытавога газу, каб пазбегнуць сонечных апёкаў, сонечных і цеплавых udараў, пераахаладжэння. Рашэнне сітуацыйных задач, звязаных з правіламі паводзін падчас прагулак у скверы, парку, лесе, каля вадаёмаў у розную пару года, у месцах вялікай колькасці людзей. Мадэляванне сітуацыі: выклік аварыйнай газавай службы па тэлефоне.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра:

кляшчоў і хваробы, якія перадаюцца пры іх укусах;

уплыў тэмпературы навакольнага асяроддзя і ўмоў надвор'я на здароўе чалавека;

сонечныя і цеплавыя удары.

Ведаць:

правілы бяспечных зносін з незнаёмымі людзьмі пры сустрэчы падчас прагулак;

правілы бяспечных паводзін пры выяўленні безгаспадарных і падазроных прадметаў у двары;

меры бяспекі ў месцах вялікай колькасці людзей;

меры засцярогі ад небяспечных насякомых, кляшчоў, змей;

прыметы ўцечкі газу;

пра бяспечны адпачынак каля вадаёма ў летнюю пару года;

прыметы і небяспека тонкага лёду;

спосабы самавыратавання на вадзе і асноўныя выратавальныя сродкі;

пра небяспеку дрыгвы і балот, меры экстранай дапамогі пры пападанні ў дрыгву, балота;

прыметы абмаражэння і пераахаладжэння.

Умець:

прытрымлівацца бяспечнага рэжыму прагулак, правіл паводзін па-за домам у вячэрні час;

паведамляць аб выяўленні безгаспадарных і падазроных прадметаў у двары;

распазнаваць небяспечныя для наведвання месцы (кар’еры, яры, будаўнічыя пляцоўкі, цеплатрасы), прагназаваць наступствы парушэння забароны на іх наведванне;

кіравацца правіламі бяспекі ў месцах вялікай колькасці людзей;

распазнаваць небяспечных прадстаўнікоў флоры і фаўны; абараняцца ад іх;

кіравацца правіламі бяспечных паводзін, апынуўшыся ў лесе, полі, каля вадаёма падчас неспрыяльных умоў надвор’я;

выконваць меры бяспекі ў выпадку ўцечкі бытавога газу;

выконваць меры бяспекі, каб пазбегнуць сонечных апёкаў, сонечных і цеплавых udараў, пераахаладжэння;

карыстацца выратавальнымі сродкамі на вадзе;

выклікаць аварыйную газавую службу.

## IV. ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ (6 гадзін)

### Гігіена дыхання

Чыстае паветра, яго значэнне для здароўя чалавека. Прычыны забруджвання паветра. Мерапрыемствы па падтрыманні чысціні паветра (павелічэнне колькасці зялёных насаджэнняў, вільготнае прыбіранне і праветрыванне памяшканняў).

Шкоднасць курэння, залежнасць ад курэння, пасіўнае курэнне.

Карысныя і шкодныя прывычкі, іх уплыў на здароўе чалавека

Карысныя прывычкі і іх уплыў на здароўе чалавека. Уплыў тытунекурэння, ужывання алкаголю і наркотыкаў на здароўе і паводзіны чалавека. Прафілактыка шкодных прывычак.

Дзеянні ў выпадку атручэння

Ядавітыя расліны і грыбы. Прыметы атручвання ядавітымі раслінамі, грыбамі. Аказанне першай дапамогі пры атручэнні.

Лекі і іх прызначэнне. Захоўванне лекаў у хатніх умовах. Небяспека няправільнага выкарыстання лекаў.

Прафілактыка траўматызму

Траўмы, атрыманыя ў быце. Аказанне першай дапамогі пры лёгкіх траўмах. Элементарныя спосабы спынення крывацёку з носа, пры парэзах. Першая дапамога пры ўдарах. Спосабы апрацоўкі невялікай ранкі.

Аказанне дапамогі пры пападанні іншароднага цела ў вока, вуха або нос, верхнія дыхальныя шляхі. Прафілактыка траўматызму.

Відэапрадукцыя (мультфільмы, гульні) і здароўе

Уплыў прагляду відэапрадукцыі на псіхіку дзяцей Гульняманія. Разумны адбор відэапрадукцыі, прыметы «шкодных» мультфільмаў, камп’ютарных гульняў. Культура прагляду відэапрадукцыі.

Віды і спосабы дзейнасці

Характарыстыка (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі, веды, атрыманыя на ўроках па прадмеце «Чалавек і свет») паветра і прычын яго забруджвання. Тлумачэнне значэння чыстага паветра для здароўя чалавека, неабходнасці праводзіць вільготнае прыбіранне і праветрыванне памяшканняў. Апісанне (вуснае) мерапрыемстваў па падтрыманні чысціні паветра. Складанне невялікіх выказванняў на прапанаваную тэму; выступленне з імі. Пераўтварэнне інфармацыі, прадстаўленай у выглядзе малюнкаў, у тэкставыя задачы. Класіфікацыя грыбоў (з апорай на веды, атрыманыя на ўроках па прадмеце «Чалавек і свет») па ядомасці. Распазнаванне ядавітых грыбоў і раслін па характэрных прыметах. Апісанне прымет атручэння ядавітымі раслінамі, грыбамі. Тлумачэнне неабходнасці выконваць правілы выбару бяспечнай відэапрадукцыі для прагляду. Складанне дыяфільма на выбраную тэму. Мадэляванне сітуацый: аказанне першай дапамогі пры атручэнні, крывацёку з носа, парэзах. Удзел у дыялогу з медыцынскім работнікам пры абмеркаванні праслуханай інфармацыі аб уплыве шкодных прывычак на здароўе і паводзіны чалавека: абагульненне інфармацыі пра прафілактыку шкодных прывычак.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць пра:

значэнне чыстага паветра для здароўя чалавека, неабходнасць правядзення вільготнага прыбірання і праветрывання памяшканняў;

ядавітыя расліны, грыбы; прыметы атручэння імі;

прычыны і агульныя прыметы лёгкіх траўм (парэзаў, ранак), атручэнняў;

прыметы «шкоднай» для псіхічнага здароўя дзяцей відэапрадукцыі.

Умець:

аказваць першую дапамогу сабе і іншым пры крывацёку з носа, сонечных апёках; апрацоўваць невялікія раны;

выклікаць брыгаду хуткай медыцынскай дапамогі пры трапленні іншароднага цела ў вока, вуха або нос;

выбіраць для прагляду адпаведную ўзросту, маральным каштоўнасцям відэапрадукцыю.

## ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IV КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін)

### І. АСАБІСТАЯ І КАЛЕКТЫЎНАЯ БЯСПЕКА (11 гадзін)

#### Правілы дарожнага руху (8 гадзін)

Кантроль забеспячэння бяспекі дарожнага руху.

Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь – орган дзяржаўнага кантролю ў галіне забеспячэння бяспекі дарожнага руху (пункт 2 падпункт 2.59; пункт 4; пункт 17 падпункт 17.5; пункт 23 падпункт 23.4; пункт 35 абзац 2 Правіл дарожнага руху).

#### Пасажыр як удзельнік дарожнага руху і транспартныя сродкі, на якіх ён перамяшчаецца

Паводзіны пасажыраў у салоне транспартнага сродку і бяспека дарожнага руху (пункт 2 падпункты 2.44, 2.8; пункт 23 падпункты 23.1, 23.2; пункт 24 падпункты 24.1, 24.2 Правіл дарожнага руху).

Асноўныя правілы бяспечных паводзін дзяцей–пасажыраў у маршрутным транспартным сродку падчас руху самастойна і ў групах.

Правілы бяспечных паводзін дзяцей–пасажыраў у легкавым аўтамабілі, на матацыкле (пункт 2 падпункт 2.44; пункты 178, 179; пункт 181 падпункты 181.5–181.7; пункт 23 падпункты 23.1, 23.2; пункт 24 падпункты 24.1, 24.2 Правіл дарожнага руху).

Выкананне пасажырамі Правіл дарожнага руху – неабходная ўмова забеспячэння асабістай і грамадскай бяспекі.

### Вадзіцель як удзельнік дарожнага руху і транспартныя сродкі, якімі ён кіруе

Вадзіцель (пункт 2 падпункт 2.8 Правіл дарожнага руху) і асаблівасці яго прафесіі. Вадзіцель і пасажыры маршрутнага транспартнага сродку. Недапушчальнасць адцягнення ўвагі вадзіцеля пасажырамі падчас руху (пункт 24 падпункты 24.1, 24.2 Правіл дарожнага руху).

### Пешаход і дарога па-за населеным пунктам

Асаблівасці пешаходнага руху на дарогах па-за населенымі пунктамі. Правілы бяспечных паводзін на дарогах, якія праходзяць па-за населенымі пунктамі, па тэрыторыі населеных пунктаў у сельскай мясцовасці (пункт 2 падпункт 2.29; пункты 17–22; пункт 131 падпункт 131.1; пункт 132 Правіл дарожнага руху; дарожныя знакі 5.22.1–5.25 (Дадатак 2 да Правіл дарожнага руху)).

### Чыгунка і бяспека

Чыгунка і яе асаблівасці. Дарожныя знакі 1.1, 1.2 (Дадатак 2, параграф 1 Правіл дарожнага руху) і сігналы дарожных святлафораў на чыгуначным пераездзе, іх значэнне (пункт 46 падпункты 46.1–46.3 Правіл дарожнага руху). Зоны асаблівай небяспекі на чыгунцы (чыгуначныя пуці, чыгуначны састаў, перон вакзала, чыгуначны пераезд).

Правілы бяспекі пры змушаным руху ўздоўж чыгуначных шляхоў: забарона гульняў паблізу чыгункі і хаджэння па чыгуначным палатне, насыпу. Правілы перасячэння чыгуначных пуцей. Правілы карыстання чыгуначным транспартам.

Метрапалітэн (метро) – від чыгуначнага транспарту, яго асаблівасці. Абсталяванне і бяспека падземнай чыгункі (эскалатары, ліфты, пад'ёмнікі, абмежавальныя лініі, сістэма відэаназірання, лакалізатары выбухаў, зоны даглядання). Правілы карыстання метрапалітэнам.

### Бяспечныя маршруты руху ў раёне пражывання і вучобы

Раён, у якім знаходзіцца ўстанова адукацыі. Ацэнка небяспек на маршрутах руху, якімі вучні часта карыстаюцца: «дом – школа – дом», «дом – бібліятэка – дом», «дом – магазін – дом» і іншыя маршруты. Выбар бяспечнага маршруту руху.

Асаблівасці руху транспартных сродкаў і пешаходаў у раёне пражывання (пункт 2 падпункт 2.46; пункт 17 падпункт 17.2; пункты 18, 36, 42; пункт 50 падпункты 50.2, 50.3; пункты 114, 135 Правіл дарожнага руху).

Віды і спосабы дзейнасці

Арыентаванне ў паняцці «Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь». Апісанне (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) асаблівасцей чыгункі і зон небяспекі на ёй. Фармуляванне правіл бяспекі пры змушаным руху ўздоўж чыгуначных шляхоў. Пераканаўчае тлумачэнне забароны на гульні паблізу чыгункі і хаджэння па чыгуначным палатне, насыпу. Апісанне (вуснае) руху па дарозе па-за населеным пунктам у адпаведнасці з Правіламі дарожнага руху. Праслухоўванне і аналіз выступленняў аднакласнікаў аб руху па загараднай дарозе падчас наведвання сваякоў: вызначэнне ў выступленнях інфармацыі, якая сведчыць аб веданні (правільным або няправільным) дзецьмі руху па загараднай дарозе. Запамінанне Правіл дарожнага руху для пасажыраў. Тлумачэнне (з апорай на даведачны матэрыял) абавязкаў пасажыраў маршрутных транспартных сродкаў. Тлумачэнне неабходнасці выконваць правілы бяспечных паводзін у час руху пешаходаў па дарогах па-за населенымі пунктамі, правілы зносін пасажыраў з вадзіцелем, правілы карыстання чыгуначным транспартам, метрапалітэнам. Выступленні па тэмах «Дзіцячая чыгунка ў Мінску», «Падземная чыгунка», «Гісторыя і сучаснасць Мінскага метро: схема ліній, інтэр’еры станцый і вестыбюляў, бяспека, цікавыя факты», падрыхтаваныя на аснове выкарыстання дадатковых крыніц інфармацыі. Пераўтварэнне інфармацыі, прадстаўленай у выглядзе малюнкаў, у тэкставыя задачы па правілах бяспечных паводзін пешаходаў і пасажыраў. Складанне індывідуальнай схемы бяспечнага маршруту ў школу і са школы дадому. Складанне памяткі па правілах паводзін пасажыраў у салоне транспартнага сродку. Мадэляванне паводзін людзей падчас руху на чыгуначным транспарце, дзяцей-пасажыраў у салоне транспартнага сродку. Маляванне плакатаў на тэму «Мы – пасажыры».

## Асабістая бяспека (3 гадзіны)

### Абарона дзяцей дзяржавай

Роля праў чалавека. Паняцці «правы чалавека», «правы дзіцяці», «права на жыццё», «абарона дзяцей дзяржавай». Азнаямленне (на ўзроўні ўяўленняў) з адным з дакументаў аб правах чалавека – Законам Рэспублікі Беларусь ад 19 лістапада 1993 г. № 2570-XII «О правах ребенка». Узаемасувязь паняццяў «права» і «абавязак».

Канфлікты і спосабы іх вырашэння

Канфлікты (абзыванне, перадражніванне, абраза, крыўдныя жарты і іншыя віды канфліктаў), асноўныя прычыны іх узнікнення. Прафілактыка канфлікту. Выбар аптымальнага спосабу вырашэння канфлікту. Адказнасць за супрацьпраўныя дзеянні, у тым ліку за наўмыснае прычыненне шкоды здароўю.

Бяспека карыстання Інтэрнэтам

Элементарныя правілы бяспечнага карыстання Інтэрнэтам. Асцярожнасць і пільнасць падчас карыстання Інтэрнэтам. Выключэнне магчымасці стаць ахвярай махлярства ў Інтэрнэце. Небяспека камп'ютарнай гульнявой залежнасці.

Віды і спосабы дзейнасці

Арыентаванне ў паняццях, якія адносяцца да праў дзіцяці, зафіксаваных у Законе Рэспублікі Беларусь «О правах ребенка». Раскрыццё паняцця «абавязак». Устанаўленне сувязі паміж правамі і абавязкамі вучняў. Апісанне (вуснае) абавязкаў вучняў. Складанне табліцы праў і абавязкаў вучняў. Тлумачэнне неабходнасці паважлівага стаўлення да праў навакольных.

Раскрыццё паняцця «канфлікт». Характарыстыка фактараў і прычын яго развіцця. Апісанне (вуснае) бяспечных і эфектыўных спосабаў пазбягання і вырашэння канфліктных сітуацый. Мадэляванне сітуацый: вырашэнне моўных канфліктаў; прымірэнне бакоў.

Тлумачэнне (з апорай на даведачны матэрыял) станоўчых магчымасцей лічбавага асяроддзя. Характарыстыка рызык і пагроз пры выкарыстанні Інтэрнэта. Складанне невялікіх выказванняў па тэме. Тлумачэнне неабходнасці выконваць правілы бяспечнага карыстання камп'ютарам. Рашэнне сітуацыйных задач на аснове выкарыстання атрыманай на ўроках інфармацыі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра:

асноўныя правы дзіцяці, зафіксаваныя ў Законе Рэспублікі Беларусь «О правах ребенка»;

паняцці, якія адносяцца да праў чалавека («правы чалавека», «правы дзіцяці», «права на жыццё», «абарона дзяцей дзяржавай»);

орган дзяржаўнага кантролю ў галіне дарожнага руху – Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь;

Мінскі метрапалітэн і рух у ім.

Ведаць:

асаблівасці руху транспартных сродкаў і пешаходаў у раёне пражывання;

пра пешаходны рух на дарогах па-за населенымі пунктамі;

правілы зносін пасажыраў з вадзіцелем маршрутнага транспартнага сродку;

асноўныя правілы бяспечных паводзін дзяцей-пасажыраў у маршрутным транспартным сродку (пры руху ў групах і самастойна), легкавым аўтамабілі, на матацыкле;

пра павышаную небяспеку чыгунак (у тым ліку метро);

правілы бяспечных паводзін пры карыстанні чыгуначным транспартам;

спосабы вырашэння моўных канфліктаў;

пра адказнасць за супрацьпраўныя дзеянні;

элементарныя правілы бяспечнага карыстання Інтэрнэтам.

Умець:

прадбачыць узнікненне небяспечных сітуацый у транспартных сродках, на дарогах па характэрных прыметах іх праяўлення; пазбягаць іх па магчымасці;

дзейнічаць у канкрэтнай небяспечнай сітуацыі з улікам рэальнай абстаноўкі і індывідуальных магчымасцей;

бяспечна перамяшчацца па дарогах па-за населенымі пунктамі, выконваючы Правілы дарожнага руху;

выконваць правілы бяспечных паводзін у маршрутным транспартным сродку (пры руху самастойна і ў групах), легкавым аўтамабілі, на матацыкле;

кіравацца правіламі бяспечных паводзін пры карыстанні чыгуначным транспартам (у тым ліку метро);

пазбягаць канфліктных сітуацый у зносінах з равеснікамі, канструктыўна вырашаць спрэчкі і рознагалоссі;

паважаць правы і добрыя якасці навакольных;

выконваць элементарныя правілы бяспечнага карыстання Інтэрнэтам.

## II. ЗАСЦЯРОГА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ. ПАЖАРНАЯ БЯСПЕКА (11 гадзін)

### Патрабаванні па забеспячэнні пажарнай бяспекі ва ўстанове адукацыі

Вогнетушыцелі, пажарнае абсталяванне і інвентар. Прызначэнне пажарнага абсталявання, якое ёсць ва ўстанове адукацыі. Правілы карыстання вогнетушыцелем.

Дзеянні вучняў пры выяўленні задымлення, узгарання, пажару.

Планы эвакуацыі. Эвакуацыйныя шляхі з класа, спартыўнай і актавай залаў, сталовай, бібліятэкі, фае ў выпадку ўзнікнення пажару. Правілы эвакуацыі. Адпрацоўка дзеянняў па эвакуацыі са школьных памяшканняў у выпадку ўзнікнення пажару.

Меры па папярэджанні атручэння дымам, атрымання апёкаў. Першая дапамога пры апёках.

### Гаручыя і лёгкаўзгаральныя вадкасці як крыніцы магчымай небяспекі

Лёгкаўзгаральныя і гаручыя вадкасці, якія ўжываюцца ў быце. Меры засцярогі пры іх захоўванні і выкарыстанні. Дзеянні ў выпадку ўзгарання гаручых і лёгкаўзгаральных вадкасцей.

### Пажары ад электрапрыбораў і электраабсталявання

Прычыны пажараў ад электрапрыбораў: няспраўнасць, кароткае замыканне, перагрузка. Пажаранебяспечны стан электрапрыбораў, разетак, электраправодкі. Першыя прыметы няспраўнасці электраабсталявання, якія могуць стаць прычынай пажару. Дзеянні ў выпадку з’яўлення дыму, іскрэння, узгарання электраправодкі або ўключаных электрапрыбораў.

### Тушэнне ўзгаранняў у пачатковай стадыі

Магчымыя спосабы бяспечнага тушэння ўзгарання. Сродкі, якія выкарыстоўваюцца для тушэння невялікага ўзгарання (вада, зямля, пральны парашок), і спосабы іх прымянення. Недапушчальнасць тушэння вадой уключаных у сетку электрапрыбораў і электраправодкі.

### Дзіцячыя і юнацкія аб’яднанні ратавальнікаў

Мэты і задачы дзейнасці дзіцячых і юнацкіх аб’яднанняў ратавальнікаў-пажарных. Гурткі, секцыі, клубы, профільныя летнія лагеры.

### На прыродзе без пажараў

Меры бяспечнага раскладвання агню на прыродзе. Правільны выбар месцаў для выкарыстання мангалаў. Правілы паводзін паблізу агню. Абавязковае прыбіранне месца адпачынку, старыннае тушэнне вогнішча і вуглёў з мангала.

Віды і спосабы дзейнасці

Арыентаванне ў паняццях, якія адносяцца да дзіцячых і юнацкіх аб’яднанняў ратавальнікаў-пажарных. Апісанне (вуснае) пажарнага абсталявання, якое ёсць ва ўстанове адукацыі, і яго прызначэння. Апісанне (з апорай на вучэбны матэрыял і ілюстрацыі) лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцей, якія выкарыстоўваюцца ў быце, іх групаванне. Тлумачэнне мер

засцярогі пры захоўванні лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцей.

Азнаямленне падчас мэтавай экскурсіі па школе з планам эвакуацыі з установы адукацыі ў выпадку надзвычайнай сітуацыі: вызначэнне бяспечных шляхоў да выхаду з будынку. Складанне схемы эвакуацыі з класа ў выпадку надзвычайнай сітуацыі. Тлумачэнне алгарытму дзеянняў па эвакуацыі з класа, школы ў выпадку пажару, выхадзе з задымленага памяшкання. Мадэляванне сітуацый: эвакуацыя з класа, школы ў выпадку надзвычайнай сітуацыі, задымлення. Адпрацоўка (з апорай на алгарытм) дзеянняў пры эвакуацыі. Апісанне дзеянняў пры тушэнні невялікага ўзгарання з выкарыстаннем падручных сродкаў: вады, зямлі, пральнага парашка. Тлумачэнне (з апорай на даведачны матэрыял) мер засцярогі пры раскладванні агню на прыродзе.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра:

дзіцячыя і юнацкія аб’яднанні ратавальнікаў–пажарных;

лёгкаўзгаральныя і гаручыя вадкасці, якія выкарыстоўваюцца ў быце;

электраабсталяванне.

Ведаць:

пажарнае абсталяванне, якое ёсць ва ўстанове адукацыі, яго прызначэнне;

правілы карыстання вогнетушыцелем;

план эвакуацыі пры ўзнікненні пажару ва ўстанове адукацыі, эвакуацыйныя шляхі з класа, спартыўнай і актавай залаў, сталовай, бібліятэкі, фае;

пра сродкі, якія выкарыстоўваюцца для тушэння невялікага ўзгарання (вада, зямля, пральны парашок), і спосабы іх прымянення;

меры бяспекі пры раскладванні агню і выкарыстанні мангалаў.

Умець:

эвакуіравацца (самастойна і з групай) з класа, спартыўнай і актавай залаў, сталовай, бібліятэкі, фае пры ўзнікненні пажару;

ліквідаваць узгаранне ў пачатковай стадыі падручнымі сродкамі;

выконваць меры засцярогі пры захоўванні лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцей.

## ІІІ. НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ І БЯСПЕКА (5 гадзін)

### Дарогі і вадаёмы ў зімовую пару года

Меры засцярогі пры руху на ўчастках дарогі або тратуара ў зімовы час. Небяспека галалёду, ледзяшоў, падзення лёду і снегу з дахаў. Верагоднасць атрымання траўм у галалёд.

Адзенне і абутак для зімовага надвор’я.

Вадаёмы зімой. Забарона выхаду на лёд вадаёмаў, катання на каньках па замёрзлых вадаёмах.

Бяспека на водах

Рэспубліканскае дзяржаўна–грамадскае аб’яднанне «Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах» (далей – АСВОД).

Правілы паводзін пры наведванні басейнаў, аквапаркаў з бацькамі, групай аднакласнікаў.

Сродкі бытавой хіміі як крыніцы небяспекі

Рэчывы, неабходныя ў хатняй гаспадарцы (пральны парашок, вадкасць і парашок для мыцця і чысткі посуду, падлогі, дываноў, мэблі, абутку), ступень магчымай небяспекі кожнага з іх. Паняцце «сродкі бытавой хіміі». Меры засцярогі пры захоўванні сродкаў бытавой хіміі і іх выкарыстанні.

Правілы паводзін у выпадку выяўлення боепрыпасаў і сродкаў паражэння або іх фрагментаў

Боепрыпасы і сродкі паражэння, іх знешнія прыметы. Дзеянні пры выяўленні боепрыпасаў або сродкаў паражэння. Негатыўныя наступствы ад неасцярожнага абыходжання з боепрыпасамі або сродкамі паражэння (траўматызм, гібель).

Віды і спосабы дзейнасці

Раскрыццё (з апорай на даведачны матэрыял, жыццёвы досвед, відэапрадукцыю) сэнсу паняццяў «сродкі бытавой хіміі», «боепрыпасы», «сродкі паражэння».

Устанаўленне сувязі паміж неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я (галалёдам, ледзяшамі, снегам на дахах) і дарожным становішчам. Апісанне (вуснае) правіл паводзін пры наведванні басейнаў. Фармуляванне мер засцярогі пры захоўванні і выкарыстанні сродкаў бытавой хіміі. Тлумачэнне неабходнасці выконваць правілы руху па дарозе або тратуары ў зімовы час, правілы паводзін пры наведванні басейнаў. Тлумачэнне неабходнасці выконваць меры засцярогі пры выяўленні боепрыпасаў або сродкаў паражэння. Апісанне (вуснае) алгарытму дзеянняў пры выяўленні боепрыпасаў або сродкаў паражэння. Адпрацоўка (з апорай на алгарытм) бяспечных дзеянняў пры выяўленні боепрыпасаў або сродкаў паражэння. Мадэляванне сітуацый: рух па тратуары зімой; наведванне басейна. Удзел у дыялогу з прадстаўніком АСВОД: устанаўленне сувязі паміж праслуханай інфармацыяй пра АСВОД і правіламі бяспечнага знаходжання каля вадаёмаў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра:
АСВОД;
сродкі бытавой хіміі;
боепрыпасы і сродкі паражэння.
Ведаць пра:
небяспеку тонкага лёду і забарону выхаду на тонкі лёд;
небяспеку галалёду, ледзяшоў, падзення лёду і снегу з дахаў; меры засцярогі пры руху па тратуарах у зімовы час;
правілы наведвання басейнаў, аквапаркаў;
меры засцярогі пры карыстанні прадметамі бытавой хіміі;
меры бяспекі пры выяўленні боепрыпасаў або сродкаў паражэння.
Умець:
выконваць меры засцярогі пры руху па тратуары у зімовы час;
выбіраць адзенне і абутак па сезоне;
выконваць правілы бяспекі пры наведванні басейнаў, аквапаркаў;
выконваць меры засцярогі пры захоўванні і выкарыстанні сродкаў бытавой хіміі;
выконваць меры бяспекі пры выяўленні боепрыпасаў.

## IV. ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ (8 гадзін)

### Ахова здароўя дзіцяці

Ахова здароўя дзіцяці. Права дзяцей на жыццё ў мірных, камфортных і бяспечных умовах (у сям’і, грамадстве) без гвалту, прыніжэнні годнасці. Прычыны парушэння праў чалавека і спосабы папярэджання парушэнняў праў чалавека.

### Бяспечныя паводзіны ў быце

Выбар бяспечных цацак, прадметаў гігіены. Прыметы «небяспечных» цацак. Небяспека траўміравання пры карыстанні пнеўматычнымі ўстройствамі.

### Правілы выбару адзення і абутку

Правілы выбару адзення і абутку ў адпаведнасці з узростам, парой года, характарам дзейнасці. Плоскаступнёвасць і яе асноўныя прычыны. Прафілактыка плоскаступнёвасці.

### Здаровае харчаванне

Традыцыі харчавання ў Рэспубліцы Беларусь. Харчаванне дома, у школьнай сталовай. Паводзіны ў школьнай сталовай.

Рацыянальнае і збалансаванае харчаванне. Групы карысных прадуктаў. Прадукты, якія не рэкамендуюцца для частага ўжывання. Правілы харчовых паводзін. Захворванні анарэксія і булімія, іх прыметы, небяспека для здароўя.

Карысныя і шкодныя прывычкі, іх уплыў на здароўе чалавека

Карысныя прывычкі, якія ўмацоўваюць здароўе. Згубныя наступствы шкодных прывычак. Тытунекурэнне і яго наступствы. Электронныя цыгарэты і іх уплыў на здароўе.

Слабаалкагольныя напіткі і іх негатыўны ўплыў на разумовую і фізічную працаздольнасць чалавека. Наркотыкі, спайсы, іх уплыў на псіхіку чалавека. Наступствы наркатычнай залежнасці. Спосабы адмовы ад назойлівых прапаноў закурыць, выпіць алкагольныя напіткі, ужыць забароненыя наркатычныя рэчывы.

Папярэджанне траўматызму падчас масавых мерапрыемстваў

Траўмы падчас паходаў. Траўмы падчас масавых свят. Папярэджанне траўматызму падчас масавых мерапрыемстваў. Правілы паводзін пры пападанні ў натоўп.

Прыёмы аказання першай дапамогі

Першая дапамога пры парэзах, драпінах, ударах, ранках. Апрацоўка ран. Спосабы часовага спынення вонкавага крывацёку. Агульныя правілы накладання павязак.

Віды і спосабы дзейнасці

Раскрыццё (з апорай на даведачны матэрыял, жыццёвы досвед, відэапрадукцыю) сэнсу паняццяў «ахова здароўя», «рацыянальнае і збалансаванае харчаванне», «пітны рэжым». Тлумачэнне неабходнасці выконваць правілы выбару адзення і абутку ў адпаведнасці з узростам, парой года, характарам дзейнасці; правілы харчовых паводзін. Фармуляванне правіл паводзін пры пападанні ў натоўп. Класіфікацыя прадуктаў харчавання па карыснасці; цацак – па бяспецы. Выступленні па тэмах «Традыцыі харчавання ў Рэспубліцы Беларусь», «Выбар адзення і абутку ў адпаведнасці з узростам, парой года, характарам дзейнасці», падрыхтаваныя на аснове выкарыстання дадатковых крыніц інфармацыі. Апісанне (вуснае) алгарытму аказання першай дапамогі. Мадэляванне сітуацый: паводзіны ў школьнай сталовай; адмова ад назойливых прапаноў, якія могуць нашкодзіць здароўю; першая дапамога пры парэзах, драпінах. Адпрацоўка дзеянняў па накладванні павязак. Адпрацоўка (з апорай на

алгарытм) дзеянняў па бяспечных паводзінах у месцах вялікай колькасці людзей. Удзел у вучэбным дыялогу з медыцынскім работнікам пры абмеркаванні праслуханай інфармацыі пра такія захворванні, як плоскаступнёвасць, анарэксія, булімія, іх прыметы і ўплыў на здароўе: інтэрпрэтацыя і абагульненне ведаў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра:

ахову дзяржавай здароўя дзіцяці;

плоскаступнёвасць і яе прафілактыку;

рацыянальнае і збалансаванае харчаванне, пітны рэжым;

захворванні анарэксію і булімію, іх прыметы і небяспеку для здароўя.

Ведаць пра:

небяспеку шэрагу цацак, магчымасць траўміравання пры карыстанні пнеўматычным устройствам;

павышаную небяспеку падчас удзелу ў масавых мерапрыемствах;

фактары, якія адмоўна ўплываюць на стан здароўя;

спосабы адмовы ад назойлівых прапаноў, якія наносяць шкоду здароўю;

агульныя правілы накладання павязак.

Умець:

выбіраць бяспечныя цацкі, прадметы гігіены і карыстацца імі;

кіравацца правіламі бяспечных паводзін пры магчымым трапданні ў натоўп;

супрацьстаяць назойлівым прапановам, якія прычыняюць шкоду здароўю;

накладваць павязкі, аказваць першую дапамогу пры парэзах, ударах.

# ГЛАВА 5
# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА В V КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін)

## I. АСАБІСТАЯ І КАЛЕКТЫЎНАЯ БЯСПЕКА (11 гадзін)

### Правілы дарожнага руху (8 гадзін)

#### Гісторыя Правіл дарожнага руху

Гісторыя ўзнікнення Правіл дарожнага руху. Іх змяненне ў сувязі з развіццём транспартных сродкаў, дарог (аўтамабільных дарог і вуліц населенага пункта) і грамадскіх зносін у сферы дарожнага руху (главы 2, 4, 5 Правіл дарожнага руху).

Транспартныя сродкі аператыўнага назначэння, іх знешні выгляд і сігнальнае абсталяванне

Транспартныя сродкі аператыўнага назначэння: МНС, міліцыі, хуткай медыцынскай дапамогі, аварыйных службаў, крыміналістычных лабараторый, мытных органаў, спецсувязі і фельдсувязі (перавозкі спецыяльнай пошты), Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, органаў пагранічнай службы, Ваеннай аўтамабільнай інспекцыі Узброенных Сіл (далей – ВАІ), органа дзяржаўнай аховы, Следчага камітэта, Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый. Іх спецыяльная афарбоўка, светлавая і гукавая сігналізацыя.

Права пераважнага праезду і адступлення ад патрабаванняў Правіл транспартных сродкаў, якія падаюць спецыяльныя гукавыя і светлавыя сігналы.

Пешаход як удзельнік дарожнага руху і спосабы яго перамяшчэння ў дарожным руху

Дзеянні пешаходаў у сітуацыях, калі падаюцца: вадзіцелем транспартнага сродку папераджальныя сігналы светлавымі паказальнікамі паваротаў або рукой; сігналы (гукавыя і жэстамі) рэгуліроўшчыка (пункт 2 падпункты 2.8, 2.59; пункты 35, 36; пункт 50 падпункты 50.2, 50.3; пункт 56 Правіл дарожнага руху). Падача вадзіцелем транспартнага сродку папераджальных сігналаў светлавымі паказальнікамі паваротаў або рукой. Сігналы свістком і жэсты рэгуліроўшчыка.

Дзеянні пешаходаў пры выяўленні транспартных сродкаў аператыўнага назначэння, якія рухаюцца па дарозе і падаюць спецыяльныя гукавыя і светлавыя сігналы (пункт 2 падпункт 2.70; пункты 20, 29 Правіл дарожнага руху).

Рэгулюемае і нерэгулюемае скрыжаванне. Правілы пераходу праезнай часткі дарогі пешаходамі на скрыжаванні па пешаходным пераходзе і дзеянні пешаходаў пры адсутнасці на скрыжаванні абазначанага дарожнымі знакамі і (або) дарожнай разметкай пешаходнага пераходу (пункт 2 падпункты 2.15, 2.33, 2.45, 2.55; пункты 17, 18, 42; дарожныя знакі 5.16.2 (Дадатак 2 да Правіл дарожнага руху); гарызантальная дарожная разметка 1.14.1, 1.14.3 (Дадатак 3 да Правіл дарожнага руху)). Сігналы святлафора на рэгулюемым скрыжаванні (пункты 39, 42 Правіл дарожнага руху).

Назіранне за рухам транспартных сродкаў і пешаходаў у час экскурсіі па населеным пункце. Рашэнне сітуацыйных задач на мясцовасці падчас назіранняў за рухам пешаходаў і транспартных сродкаў. Правілы забеспячэння бяспекі пры пераходзе пешаходамі праезнай часткі дарогі на скрыжаванні, па пешаходным пераходзе і па-за пешаходным пераходам (пункт 2 падпункт 2.29; пункт 17 падпункт 17.2; пункты 18, 42, 114, 135 Правіл дарожнага руху; дарожныя знакі 5.16.1, 5.16.2, 5.22.1–5.23.2 (Дадатак 2 да Правіл дарожнага руху); гарызантальная дарожная разметка 1.14.1, 1.14.3 (Дадатак 3 да Правіл дарожнага руху)).

Рух вучняў групамі і ў калоне

Парадак руху вучняў групамі па тратуары, пешаходнай і веласіпеднай дарожках, абочыне дарогі, пешаходным пераходзе, у жылой і пешаходнай зоне.

Парадак руху вучняў у калоне. Правілы пасадкі і высадкі групы вучняў з аўтобуса, тралейбуса, трамвая (пункт 2 падпункты 2.21, 2.25, 2.48; пункты 17, 18, 21, 22; пункт 23 падпункт 23.1; пункт 24 падпункт 24.2; пункт 131 падпункт 131.1; пункт 135 Правіл дарожнага руху; дарожныя знакі 4.5.1–4.6.2, 5.16.1, 5.16.2, 5.38–5.41 (Дадатак 2 да Правіл дарожнага руху), гарызантальная дарожная разметка 1.29–1.31, 1.33 (Дадатак 3 да Правіл дарожнага руху).

Віды і спосабы дзейнасці

Удзел у гутарцы пры праслухоўванні матэрыялу па гісторыі правіл дарожнага руху: падрыхтоўка адказаў на пытанні, складанне пытанняў, фармуляванне вывадаў. Арыентаванне ў дакуменце «Правілы дарожнага руху ў Рэспубліцы Беларусь» па главах: «Агульныя правы і абавязкі ўдзельнікаў дарожнага руху», «Правы і абавязкі пешаходаў», «Абавязкі пасажыраў».

Вызначэнне крыніц і зон павышанай небяспекі населенага пункта. Тлумачэнне неабходнасці прытрымлівацца правіл бяспечных паводзін у зонах павышанай небяспекі населенага пункта.

Характарыстыка ўдзельнікаў дарожнага руху. Апісанне (вуснае) змен у Правілах дарожнага руху. Вызначэнне прычын дарожна–транспартных здарэнняў. Тлумачэнне прынцыпаў бяспечных паводзін на дарозе і ў транспарце. Фармуляванне правіл паводзін для веласіпедыста.

Аналіз сітуацый, у якіх прасочваюцца як правільныя, так і памылковыя дзеянні равеснікаў – удзельнікаў дарожнага руху. Складанне прэзентацыі (плакатаў, фотаматэрыялаў).

Складанне бяспечнага маршруту (падчас віртуальнага падарожжа) ад выбранага месца на ўчастку дарогі ў раёне пражывання да ўстановы адукацыі (без мультымедыйнага суправаджэння).

Разгляд небяспечных сітуацый, звязаных з чыгуначным транспартам, выказванне меркаванняў. Аналіз інфармацыі, прадстаўленай у выглядзе малюнкаў і тэксту; устанаўленне прычын узнікнення небяспечных сітуацый пры руху на эскалатары, чаканні цягніка, знаходжанні ў вагоне.

Складанне маршрутаў руху дзяцей групай, калонай. Арыентаванне (з апорай на мультымедыйную прэзентацыю) у паняццях «скрыжаванне», «абазначанае скрыжаванне». Ролевая гульня з выкарыстаннем мадэлі скрыжавання. Дэманстрацыя і трактоўка жэстаў рэгуліроўшчыка. Рашэнне сітуацыйных задач, звязаных з веданнем ці няведаннем сігналаў рэгуліроўшчыка жэстамі і свістком.

Удзел у вучэбным дыялогу з супрацоўнікамі дзяржаўнай аўтаінспекцыі пры абмеркаванні праслуханай інфармацыі аб праблемах, з якімі сутыкаюцца ўдзельнікі дарожнага руху пры парушэнні правіл: абагульненне ведаў.

Рашэнне сітуацыйных задач на мясцовасці падчас экскурсіі. Распрацоўка праекта «Мой бяспечны маршрут у школу і дадому».

## Асабістая бяспека (3 гадзіны)

### Правілы паводзін пры сустрэчы з групай асоб, якія ўяўляюць небяспеку

Месцы асаблівай небяспекі ў навакольным асяроддзі, сустрэча з групай асоб, якія ўяўляюць небяспеку («небяспечнай» кампаніяй). Правілы бяспечных зносін пры сустрэчы з незнаёмымі людзьмі на вуліцы, у транспарце, пад’ездзе, ліфце, парку і іншых месцах. Правілы паводзін з равеснікамі. Паняцце «міжасобасныя адносіны» (фармальныя, нефармальныя). Канфлікты ў вучнёўскіх калектывах, іх прычыны, працідзеянне гвалту і прыніжэнню. Правілы і нормы ўзаемаадносін паміж равеснікамі. Асабістая адказнасць за правапарушэнні.

Адрасы і кантактныя тэлефоны асоб і арганізацый, якія аказваюць дапамогу і падтрымку непаўналетнім у сацыяльна небяспечным становішчы.

### Правілы паводзін у выпадку ўзяцця ў заложнікі і правядзення спецаперацыі па вызваленні заложнікаў

Паняцце «заложнік». Правілы паводзін пры захопе ў заложнікі і ў ходзе аперацыі па вызваленні заложнікаў.

### Бяспечнае карыстанне Інтэрнэтам

Меры бяспекі пры рабоце ў Інтэрнэце, зносінах у сацсетках. Адказнасць за парушэнне заканадаўства.

Віды і спосабы дзейнасці

Характарыстыка небяспечных сітуацый, аналіз асаблівасцей небяспечных сітуацый. Адрозненне надзвычайных сітуацый па прычынах узнікнення і наступствах.

Рашэнне сітуацыйных задач па тэмах «Месцы асаблівай небяспекі», «Сустрэча з небяспечнай кампаніяй», «Магчымасць выкрадання».

Абмеркаванне розных спосабаў праяўлення экстрэмізму і тэрарызму. Складанне праграмы дзеянняў:

пры выяўленні падазронага прадмета;

у месцах вялікай колькасці людзей;

калі адбыўся захоп заложнікаў і пры правядзенні спецаперацыі па вызваленні заложнікаў.

Удзел у вучэбным дыялогу пры абмеркаванні пытанняў бяспечнага карыстання Інтэрнэтам: складанне выказванняў па тэме, фармуляванне вывадаў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне пра:

гісторыю ўзнікнення Правіл дарожнага руху, іх дынамічнасць у сувязі са змяненнем транспартных сродкаў, дарог;

паняцце «заложнік», тэрарыстычны акт.

Ведаць:

парадак руху ў групе, калоне па тратуары, пешаходнай і веласіпеднай дарожках, абочыне дарогі, пешаходным пераходзе;

пра папераджальныя сігналы, якія падае вадзіцель транспартнага сродку светлавымі паказальнікамі паваротаў або рукой; сігналы рэгуліроўшчыка свістком і жэстамі;

транспартныя сродкі аператыўнага назначэння: крыміналістычных лабараторый, мытных органаў, спецсувязі і фельдсувязі (перавозкі спецыяльнай пошты), Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, органаў пагранічнай службы, ВАІ, органа дзяржаўнай аховы, Следчага камітэта, Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый;

асноўныя прынцыпы рэгулявання стасункаў паміж равеснікамі (прынцыпы раўнапраўя, узаемадапамогі, мірнага вырашэння канфліктаў, уліку разнастайнасці поглядаў і інтарэсаў, справядлівасці і іншыя прынцыпы);

пра адказнасць за супрацьпраўныя дзеянні, у тым ліку за наўмыснае прычыненне шкоды здароўю і матэрыяльнага ўрону;

адрасы і кантактныя тэлефоны асоб і арганізацый, якія аказваюць дапамогу і падтрымку тым, хто аказаўся ў сацыяльна небяспечным становішчы;

правілы паводзін у выпадку ўзяцця ў заложнікі;

меры бяспекі пры рабоце ў Інтэрнэце, зносінах у сацсетках.

Умець:

выконваць парадак руху ў групе, калоне па тратуары, пешаходнай і веласіпеднай дарожках, абочыне дарогі, пешаходным пераходзе;

пераходзіць праезную частку дарогі на скрыжаванні з прытрымліваннем Правіл дарожнага руху;

выконваць адпаведныя Правілам дарожнага руху дзеянні ў якасці пешахода пры выяўленні транспартных сродкаў аператыўнага назначэння, якія рухаюцца па дарозе і падаюць спецыяльныя гукавыя і светлавыя сігналы;

супрацьстаяць дзеянням, якія зневажаюць годнасць; прымяненню фізічнай сілы з боку равеснікаў, дарослых; уцягванню ў проціпраўную дзейнасць;

аргументавана і паважліва адстойваць уласны пункт гледжання;

выконваць правілы і нормы міжасобасных стасункаў паміж равеснікамі;

крытычна ацэньваць факты парушэння праў чалавека ў кампаніі (класе, двары);

праяўляць пільнасць і выконваць меры бяспекі пры пагрозе тэрарыстычнага акта, захопу ў заложнікі;

звяртацца па дапамогу ў выпадку ўзнікнення сацыяльна небяспечнага становішча.

## II. ЗАСЦЯРОГА АД НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЙ (8 гадзін)

### Пажарная бяспека (5 гадзін)

#### Пажары і прычыны іх узнікнення

Небяспека ўзгарання сухога лісця, травы, сена. Небяспека раскладвання агню для спальвання смецця на прысядзібных і дачных участках. Недапушчальнасць выкарыстання для распальвання лёгкаўзгаральных рэчываў. Узнікненне пажару ў доме ад крыніц агню паблізу (вогнішча, падпаленая сухая трава, пажар у суседнім будынку, лясны пажар); у кватэры – пры пажары ў пад’ездзе, размешчаных побач кватэрах. Захаванне мер бяспекі ў доме, кватэры.

#### Пажаранебяспечныя аб’екты

Наступствы неасцярожнага абыходжання з агнём у хлявах, падвалах, гаражах, сенасховішчах, на гарышчах. Недапушчальнасць выкарыстання запалак, запальнічак, свечак для асвятлення падобных аб’ектаў. Загрувашчанасць і павышаная пажарная небяспека гарышч і падвальных памяшканняў. Захаванне мер засцярогі ў месцах, дзе складзіруецца сена.

Лёгкаўзгаральныя і гаручыя вадкасці, якія разліліся. Дзеянні пры першых прыметах узгарання (з’яўленне дыму, паху тлеючай электраправодкі, іскрэння).

Бяспечны дом

Патрабаванні па забеспячэнні пажарнай бяспекі пры абаграванні жылых памяшканняў. Бяспечнае карыстанне печамі, камінамі, бытавымі электраабагравальнікамі, газавымі катламі.

Небяспека бытавога газу. Правілы карыстання газавай плітой

Бяспечныя паводзіны пры выкарыстанні гаручых матэрыялаў. Недапушчальнасць абагравання жылых памяшканняў з дапамогай газавых і электрычных пліт. Неабходнасць выканання патрабаванняў па забеспячэнні пажарнай бяспекі.

Бяспека ў надзвычайных сітуацыях (3 гадзіны)

Надзвычайныя сітуацыі прыроднага характару

Паняцце аб надзвычайных сітуацыях: прыродныя і тэхнагенныя. Прыметы небяспечных прыродных з’яў. Агульныя звесткі пра віды прыродных надзвычайных сітуацый. Правілы паводзін пры пагрозе і ўзнікненні надзвычайных сітуацый прыроднага характару.

Гідралагічныя надзвычайныя сітуацыі

Агульная характарыстыка гідралагічных надзвычайных сітуацый. Характэрныя для нашай рэспублікі надзвычайныя сітуацыі: паводка, затапленне, разводдзе, павышэнне ўзроўню грунтавых вод. Меры па папярэджанні і зніжэнні негатыўных наступстваў. Дзеянні людзей у зоне ўзнікнення падобных надзвычайных сітуацый, падрыхтоўка да магчымай эвакуацыі. Алгарытм паводзін у выпадку, калі эвакуацыя немагчыма.

Віды і спосабы дзейнасці

Тлумачэнне (з апорай на відэадэманстрацыю або прэзентацыю) забароны на спальванне смецця, леташняга лісця, галінак. Апісанне (вуснае) небяспекі восеньскіх пажараў. Фармуляванне мер бяспекі пры раскладванні агню.

Распазнаванне небяспечных і аварыйных сітуацый у доме (кватэры). Тлумачэнне неабходнасці выконваць правілы бяспечных паводзін у быце. Устанаўленне прычын пажараў у жылых і грамадскіх будынках. Разгляд індывідуальных сродкаў пажаратушэння, абмеркаванне спосабаў іх прымянення пры пажары.

Рашэнне праблемных задач, звязаных з небяспекай электрычных і электронных прыбораў, што выкарыстоўваюцца ў быце, наступствамі паражэння электрычным токам. Разгляд мер бяспекі пры карыстанні электрапрыборамі, тлумачэнне неабходнасці іх прытрымлівацца.

Складанне памятак «Першыя прыметы пажару ад электраабсталявання», «Дзеянні ў выпадку ўзгарання».

Удзел у сітуацыйных гульнях «Назаві свае дзеянні»: а) пры іскрэнні разеткі; б) пры ўзгаранні тэлевізара; в) пры адключэнні электрычнасці; г) пры задымленні ад шчытка. Аналіз сітуацый: «Калі трэба выклікаць пажарных, а калі можна справіцца самім?»

Падрыхтоўка інфармацыі пра службы гарантавання бяспекі ў адпаведнасці з іх прызначэннем. Замацаванне навыку іх выкліку.

Вывучэнне дзеянняў па сігнале апавяшчэння «Увага ўсім!».

Разгляд магчымых варыянтаў выратавання з розных сітуацый. Абмеркаванне пытання: «Што рабіць пры задымленні ў пад’ездзе?».

Абмеркаванне прычын атручвання чадным газам у дамах з пячным ацяпленнем. Апісанне (вуснае) прымет атручвання чадным газам. Складанне памятак: «Правілы паводзін пры ўцечцы газу», «Першая дапамога пры атручэнні чадным газам», «Першая дапамога пры атручэнні ядахімікатамі».

Распазнаванне прыродных і тэхнагенных надзвычайных сітуацый па характэрных прыметах.

Вызначэнне прыродных надзвычайных сітуацый, характэрных для Рэспублікі Беларусь. Аналіз правіл сваіх магчымых паводзін у выпадку ўзнікнення той або іншай надзвычайнай сітуацыі. Складанне інструкцыі аб асаблівасцях паводзін пры розных надзвычайных сітуацыях. Ацэньванне вучнямі-экспертамі вынікаў сумеснай дзейнасці аднакласнікаў.

Выкарыстанне розных крыніц інфармацыі – інтэрнэт-рэсурсаў, падручніка, ілюстрацый – для падрыхтоўкі паведамлення аб надзвычайнай сітуацыі (на выбар).

Разгляд дзеянняў у выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі. Вылучэнне галоўных «крокаў» у сістэме апавяшчэння.

Замацаванне падчас мэтавай экскурсіі па школе ведаў па плане эвакуацыі з установы адукацыі і ўменняў эвакуіравацца ў выпадку надзвычайнай сітуацыі.

Стварэнне асабістага тэлефоннага даведніка важных нумароў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць пра:

магчымае ўзнікненне пажару ў доме з-за крыніц агню паблізу (вогнішча, падпаленая сухая трава, пажар у суседнім будынку, лясны пажар);

пажаранебяспечныя аб’екты (хлявы, падвалы, гарышчы, гаражы, сенасховішчы); наступствы неасцярожнага абыходжання з агнём у іх;

надзвычайныя сітуацыі: прыродных і тэхнагенных, іх прыметы;

гідралагічныя надзвычайныя сітуацыі, характэрныя для Рэспублікі Беларусь: паводку, затапленне, разводдзе, павышэнне ўзроўню грунтавых вод.

Умець:

карыстацца газавай плітой;

выконваць меры засцярогі пры змушаным наведванні пажаранебяспечных аб’ектаў (хлявоў, падвалаў, гаражоў, сенасховішчаў, гарышч);

выконваць правілы паводзін пры пагрозе і ўзнікненні надзвычайных сітуацый прыроднага характару (паводкі, затаплення, разводдзя, павышэння ўзроўню грунтавых вод);

ажыццяўляць падрыхтоўку да магчымай эвакуацыі; дзейнічаць у выпадках немагчымасці эвакуацыі.

## III. НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ І БЯСПЕКА (8 гадзін)

### Небяспека ртуцьзмяшчальных прыбораў

Ртуць і яе таксічныя ўласцівасці. Асноўныя ртуцьзмяшчальныя прыборы ў быце. Візуальнае распазнаванне ртуці. Небяспека ртуці пры парушэнні герметычнасці прыбораў. Дзеянні пры пашкоджанні ртуцьзмяшчальных прыбораў і пры выяўленні ртуці. Правілы ўтылізацыі ртуці і ртуцьзмяшчальных прыбораў.

### Правілы паводзін у розных умовах надвор’я

Сонечныя апёкі, сонечныя і цеплавыя ўдары. Меры па іх папярэджанні. Першая дапамога пацярпеўшым. Правілы паводзін каля вадаёмаў у спякотнае надвор’е.

Меры па папярэджанні негатыўных наступстваў знаходжання на вуліцы ў моцны мароз. Абмаражэнне, меры прафілактыкі. Меры аказання дапамогі пры абмаражэннях рознай ступені цяжкасці, пераахаладжэнні.

### Меры бяспекі пры купанні і плаванні

Правілы паводзін каля вадаёмаў. Месцы, небяспечныя для купання. Забараняльныя знакі. Меры бяспекі пры плаванні і ныранні. Прадухіленне траўм пры плаванні, ныранні, знаходжанні на беразе. Аказанне дапамогі і самадапамогі пры сутаргах падчас знаходжання ў вадзе.

Траўмы і іх прычыны.
Меры і спосабы аказання дапамогі

Віды траўм. Прычыны траўм. Месцы, дзе існуе вялікая верагоднасць атрымання траўм. Хатні траўматызм. Аказанне першай дапамогі пры ўдарах, ранках, парэзах, насавым крывацёку.

Віды і спосабы дзейнасці

Апісанне асноўных ртуцьзмяшчальных прыбораў у быце. Тлумачэнне неабходнасці выконваць правілы карыстання дадзенымі прыборамі, меры засцярогі пры пашкоджанні ртуцьзмяшчальных прыбораў або выяўленні ртуці. Выпрацоўка (з апорай на алгарытм) навыку бяспечных дзеянняў пры зборы ртуці ў хатніх умовах у выпадку, калі разбіўся ртутны тэрмометр.

Характарыстыка асноўных небяспечных умоў надвор'я ў месцах пражывання і іх наступстваў. Тлумачэнне мер засцярогі ў небяспечных умовах надвор'я.

Складанне невялікіх выказванняў па прапанаванай тэме.

Апісанне (вуснае) прымет перагрэву на сонцы, сонечных апёкаў і меры па іх папярэджанні. Тлумачэнне сэнсу паняццяў «сонечны ўдар» і «цеплавы ўдар». Рэканструкцыя ведаў аб правілах паводзін каля вадаёмаў летам.

Падрыхтоўка паведамленняў па тэмах «Адзенне. Абутак. Галаўныя ўборы», «Ежа», «Прыметы абмаражэння», «Першая дапамога пры абмаражэнні» і выступленні ў рамках правядзення вучнёўскай канферэнцыі «Як пазбегнуць абмаражэння».

Складанне памятак «Выбар месца для плавання і нырання», «Як пазбегнуць траўм пры плаванні і ныранні», «Выкананне рэжыму купання». Выкананне тэставых заданняў па вывучаным матэрыяле.

Апісанне (з апорай на дэманстрацыйныя плакаты) спосабаў дапамогі пры сутаргах.

Фармуляванне агульных правіл аказання першай дапамогі. Апісанне (вуснае) першай дапамогі пры ўдарах, ранках, парэзах, насавым крывацёку.

Адпрацоўка практычных навыкаў па аказанні першай дапамогі пры ўдарах, ранках, парэзах, насавым крывацёку падчас дзелавой гульні, у якой вучні разыгрываюць розныя ролі: пацярпеўшыя, урачы, сведкі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць пра:

таксічныя ўласцівасці ртуці;

правілы паводзін у розных умовах надвор’я (у спёку, моцны мароз);

меры аказання дапамогі пры абмаражэнні і пераахаладжэнні;

меры бяспекі пры плаванні і ныранні;

траўманебяспечныя месцы ў навакольным асяроддзі.

Умець:

выконваць адпаведныя правілам дзеянні пры пашкоджанні ртуцьзмяшчальных прыбораў і пры выяўленні ртуці;

выконваць меры засцярогі для папярэджання ў спякотныя сонечныя дні сонечнага і цеплавога ўдараў, у моцны мароз – абмаражэння;

аказваць першую дапамогу пры абмаражэнні і пераахаладжэнні, сонечных і цеплавых ударах;

выконваць правілы бяспекі пры плаванні і ныранні;

аказваць першую дапамогу і самадапамогу пры сутаргах і траўмах на вадзе.

## IV. ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ (8 гадзін)

### Асабістая гігіена

Гігіена цела, адзення і прадметаў хатняга ўжытку. Гігіена харчавання.

### Фізічныя нагрузкі

Рухальная актыўнасць і загартоўванне арганізма – неабходныя ўмовы ўмацавання здароўя. Аптымальны рэжым фізічнай нагрузкі. Важнасць фізічнай нагрузкі і яе станоўчы ўплыў на арганізм. Фізічная нагрузка як прафілактыка захворванняў, у тым ліку ішэмічнай хваробы сэрца, артэрыяльнай гіпертэнзіі, атлусцення.

### Інтэрнэт-залежнасць

Шкоднасць для здароўя чалавека празмернага знаходжання ў Інтэрнэце. Магчымыя небяспекі сацыяльных сетак, залежнасць ад Інтэрнэта. Камп’ютарная гульнявая залежнасць. Прафілактыка камп’ютарнай залежнасці.

### Шкоднасць курэння

Нікацінавая залежнасць. Шкода, якую наносіць курэнне здароўю чалавека. Назойлівыя прапановы закурыць. Спосабы адмовы ад прапаноў, якія наносяць шкоду здароўю.

### Шкоднасць алкаголю

Алкагалізм, яго сацыяльныя наступствы і ўплыў на рэпрадуктыўнае здароўе чалавека. Шкода, якую наносіць алкаголь здароўю чалавека. Алкаголь – выбар, які навязваецца. Спосабы адмовы ад прапаноў, якія наносяць шкоду здароўю.

Наркотыкі

Наркаманія, яе сацыяльныя наступствы і ўплыў на рэпрадуктыўнае здароўе чалавека. Шкода, якую наносяць наркотыкі псіхічнаму і фізічнаму здароўю чалавека. Навязаны выбар наркотыкаў. Спосабы адмовы ад прапаноў, якія наносяць шкоду здароўю.

Віды і спосабы дзейнасці

Арыентаванне ў паняццях, якія адносяцца да здароўя: «рухальная актыўнасць», «загартоўванне». Вызначэнне асноўных складальнікаў здароўя. Характарыстыка сутнасці рухальнай актыўнасці, загартоўвання, рацыянальнага харчавання.

Аналіз прыказак і прымавак пра здароўе, выказванне версій, якія правілы здаровага ладу жыцця яны прапануюць. Выкарыстанне розных інфармацыйных сродкаў (даведнікаў, энцыклапедый, Інтэрнэта) для складання паведамленняў аб правілах жыцця нашых продкаў, іх стаўленні да свайго фізічнага і псіхічнага здароўя, і адлюстраванні гэтых уяўленняў у розных жанрах фальклору.

Складанне праграмы загартоўвання для чалавека, які схільны да прастудных захворванняў.

Тлумачэнне негатыўнага ўплыву на здароўе чалавека празмернага знаходжання ў Інтэрнэце. Прагляд, аналіз, абмеркаванне матэрыялу прэзентацыі «Як развіваецца камп’ютарная залежнасць».

Тлумачэнне згубнага ўплыву шкодных прывычак на здароўе вучняў. Праслухоўванне і аналіз паведамленняў аб прамой залежнасці паспяховасці вучняў ад курэння, шкодзе, якую наносяць здароўю тытунекурэнне, ужыванне алкаголю, наркаманія. Фармуляванне вывадаў аб жыццёвых перспектывах тых, хто ўжывае алкаголь, наркотыкі, тытунь: хворыя лёгкія, зніжаныя вынослівасць і імунітэт.

Падрыхтоўка плаката «Курыць – здароўю шкодзіць». Мадэляванне сітуацый: адмова ад назойлівых прапаноў; небяспечныя сустрэчы.

Выкананне тэставых заданняў па выніках засваення вывучанага матэрыялу па вучэбным прадмеце «Асновы бяспекі жыццядзейнасці».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць пра:

рухальную актыўнасць і загартоўванне арганізма як пра неабходныя ўмовы ўмацавання здароўя;

камп'ютарную залежнасць;

шкоду, якую наносяць здароўю курэнне, ужыванне алкаголю, наркотыкаў;

спосабы адмовы ад прапаноў, якія наносяць шкоду здароўю.

Умець:

весці здаровы лад жыцця;

процістаяць негатыўным уздзеянням сацыяльнага асяроддзя;

выбіраць карэктныя спосабы адмовы ад прапаноў, якія навязваюцца;

валодаць спосабамі засцярогі ад інфармацыйных пагроз;

процістаяць камп'ютарнай залежнасці.